Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. На 3 — 2 р. 70 к. На 6 — 5 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Змена адрэсу: іншагародняя — 20 к. Мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапіраўі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапіраўі наперад тэксту 1 р. — к. За радок шапіраўі перад тэкстам 1 р. 50 к. Абвесткі на 50 проц. дарожай. Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. кошту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 128 (2617) Субота, 8-га чэрвеня 1929 г.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

ШТО ПАСТАНАВІЎ V-ты ЎСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ

(З дакладу тав. Чарвякова на Пленуме Менскага Гарсавету).

ПРЫНЯТЫ ЗЬЕЗДАМ ПЯЦІГАДОВЫ ПЛЯН ПОУНАСЬЦЮ АДПАВЯДАЕ ЗАДАЧАМ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ І ПРАДУГЛЕДЖВАЕ ДАЛЕЙШЫ УЗДЫМ МАТАР'ЯЛЬНАГА І КУЛЬТУРНАГА УЗРОУНЮ ПРАЦОУНЫХ МАС.

6-га чэрвеня на Пленуме Менскага Гарсавету выступіў з вялікім дакладам Старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў аб выніках V Ўсесаюзнага Зьезду Саветаў.

Наша палітыка—палітыка міру.

V-ты Ўсесаюзны Сьезд Саветаў,—кажа тав. Чарвякоў,—закончыў шырокую кампанію па перавыбарах саветаў, якія былі праведзены на працягу апошніх некалькіх месяцаў. У часы справаздачных і перавыбарчых сходаў ставіліся на абгаварэньне мас тыя самыя пытаньні, што былі пастаўлены ў парадак дню V Ўсесаюзнага Зьезду Саветаў.

Рабочыя, сяляне, усе працоўныя Савецкага Саюзу, выбіраючы сваіх дэлегатаў на Ўсесаюзны Зьезд Саветаў, разам з гэтым давалі наказы сваім прадстаўнікам. Такім парадкам Усесаюзны Зьезд Саветаў, на якім прысутнічала звыш 2500 дэлегатаў, зьявіўся сапраўдным арганізаваным розумам і воляй працоўных гораду і вёскі.

Кожны з нас павінен ведаць аб працы зьезду, яго пастановах, лічыць гэтыя пастановы абавязковымі і прымаць усе захады дзеля выкананьня іх.

Усю працу зьезду і яго пастановы можна падзяліць на дзьве асноўныя часткі: 1) аб міжнародным становішчы і 2) аб далейшых задачах сацыялістычнага будаўніцтва.

Зьезд ухваліў міжнародную палітыку савецкага Ўраду. Зьезд прызнаў, што і надалей міжнародная палітыка савецкага Ўраду павінна быць накіравана на тое, каб абараняць заваёвы Кастрычніка, стаяць на чале аховы міру, узмацняць у мэтах разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва добрасуседзкія адносіны з капіталістычнымі дзяржавамі, узмацняць аўтарытэт саветаў у вачох працоўных усяго сьвету шляхам выкрыцьця супярэчнасьцяй і хітрыкаў буржуазіі. Дзякуючы мудрай міжнароднай палітыцы савецкага Ўраду, удалося дабіцца некаторага паслабленьня тых абвостраных узаемаадносін з капіталістычнымі краінамі, якія злажыліся непасрэдна пасьля IV зьезду саветаў.

У сучасны момант мы маем адзнакі, што тыя колы буржуазіі, якія гатовы пайсьці на згоду з намі, пачынаюць заваёўваць значныя ўплывы ў капіталістычных дзяржавах (Англія, Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты); аднак, і на сёньня ня зьменшыліся ў аснове адносіны да нас капіталістычных дзяржаў.

Дзякуючы таму, што мы не адступалі і не адступім ад пазіцый Кастрычнікавай рэвалюцыі, варожасьць да саветаў з боку капіталістычных дзяржаў не паслабляецца, і імкненьне капіталістычных дзяржаў да абкружэньня Савецкага Саюзу захоўваецца ў сіле.

Такім парадкам, на падставе агляду міжнароднага становішча за мінулы час мы павінны зрабіць вывад аб тым, што небясьпека нападу на СССР ёсьць і зараз, і што гэта небясьпека ў значнай меры паслабляецца ўменьшэньнем савецкага Ўраду рабіць удалыя манэўры ў міжнароднай палітыцы. Гэта вымагае ад нас адносіцца з вялікай асьцярогаю і да тых дэкляратыўных мерапрыёмстваў у справе ўсеагульнага разброеньня, якія праводзяцца капіталістычнымі дзяржавамі.

Савецкі Ўрад прымаў удзел у гэтых мерапрыёмствах, каб паказаць, што ён хоча выкарыстаць кожную магчымасьць дзеля абароны міру. Разам з гэтым савецкі Ўрад унёс шэраг сваіх прапаноў аб усеагульным разброеньні. Адносіны да прапаноў Савецкага Саюзу з боку капіталістычных дзяржаў паказваюць усю няшчырасьць капіталістаў у справе забароны вайны.

Гэта прымусіла зьезд саветаў даць цьвёрдую дырэктыву Ўраду пільна сачыць за міжнароднымі падзеямі і надалей цьвёрда стаяць на абароне міру. У той жа час зьезд саветаў улічыў, што пад прыкрыцьцём папяровага пацыфізму ў капіталістычных дзяржавах ідзе разгорнутая вайсковая падрыхтоўка да вайны, і пастанавіў, каб і савецкі Ўрад зьвярнуў увагу на далейшае ўзмацненьне Чырвонай арміі. Важнейшым фактарам узмацненьня міжнароднага становішча Савецкага Саюзу зьяўляецца моц і разьвіцьцё гаспадаркі і культуры Савецкага Саюзу і ўнутранай палітычнай устойлівасьці. Мы павінны адзначыць, што нашым посьпехам у міжнароднай палітыцы ў значнай меры садзейнічае тое, што за мінулыя гады Савецкі Саюз жыў пад знакам аднаўленьня вялізарнага росту сваёй гаспадаркі. Усе сілы працоўных і савецкага Ўраду былі накіраваны на тое, каб шырока разгарнуць сацыялістычную гаспадарку і культурнае будаўніцтва. Дзякуючы гэтаму, нам удалося амаль што аднавіць усе галіны нашай гаспадаркі да даваеннага ўзроўню, а ў некаторых выпадках значна пайсьці ўперад ад гэтага да даваеннага ўзроўню.

Чым выклікаюцца нашы цяжкасьці.

Вельмі важна адзначыць тое, што нашым посьпехам у значнай меры служыла дапамогай перавага савецкай сыстэмы дзяржаўнасьці перад сыстэмай капіталістычнай. Можна лёгка даказаць, што каб працу па аднаўленьні гаспадаркі нам прыходзілася праводзіць ва ўмовах капіталістычнай сыстэмы, дык гэтых посьпехаў мы ня мелі-б.

Дыктатура пралетарыяту, сканцэнтраваўшы волю працоўных, зьбіраючы матар'яльныя сродкі з агульна-народных прыбыткаў, накіроўвае гэтыя сродкі на сацыялістычнае будаўніцтва.

У капіталістычных-жа краінах асноўным штурхачом усялякага будаўніцтва зьяўляецца карысьць і інтарэс паасобнага капіталіста або групы капіталістаў.

Вось гэта розьніца і складае падставу перавагі савецкай сыстэмы, што забясьпечвае нам нашыя вялікія посьпехі.

Зразумелая рэч, што гаворачы аб посьпехах мы ня маем права заплюшчваць вочы і на перажываемыя намі цяжкасьці.

Аднак, вывучаючы прыроду перажываемых цяжкасьцяй, мы павінны прызнаць, што нашы цяжкасьці зьяўляюцца вынікам нашага росту, а ня нашага ўпадку.

Мы перажываем цяжкасьці недахопаў у матар'яльным дабрабыце, у той час, як капіталістычныя дзяржавы перажываюць цяжкасьці ад перавытворчасьці.

Нашы цяжкасьці зьяўляюцца вынікам таго, што ў працоўных мас гораду і вёскі растуць усё новыя запатрабаваньні на падставе палепшаньня іх становішча, культурнага разьвіцьця і г. д. І разам з гэтым растуць магчымасьці кунляць усё неабходнае для здавальненьня гэтых запатрабаваньняў.

Вось чаму пры агульным росьце вытворчасьці мы перажываем недахоп тавараў і г. д., а цяжкасьці капіталістаў адбываюцца таму, што ў капіталістычных дзяржавах ідзе ажабрачваньне працоўных мас, зьмяншаецца іх магчымасьць кунляць, адбываецца застой у гандлі і г. д.

З гэтага відаць, што мы маем перад сабой шырокія пэрспэктывы далейшага разьвіцьця на базе ўсё большага задаваленьня патрэб гораду і вёскі. Такім чынам, дасягнутыя намі ў мінулым посьпехі ёсьць моцная база для далейшага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

Твар 5-цігодкі.

Зьезд саветаў разглядзеў і зацьвердзіў далейшы пяцігадовы плян разьвіцьця гаспадаркі і культуры Савецкага Саюзу, выдзеліўшы, як асобную частку, пытаньне аб разьвіцьці сельскай гаспадаркі.

16-я канфэрэнцыя ЎсеКП(б) таксама разглядзела і зацьвердзіла гэты плян. У пастановах канфэрэнцыі гаворыцца аб тым, што пяцігадовы плян разьвіцьця гаспадаркі і культуры Савецкага Саюзу зьяўляецца практычнай часткай праграмы камуністычнай партыі ў барацьбе за перамогу сацыялізму.

Такое значэньне пяцігодкі прымушае нас з асаблівай уважлівасьцю вывучаць гэты плян і прыняць усе захады дзеля яго выкананьня. Наступныя лічбы могуць у агульных рысах вызначыць асноўныя напрамкі зацьверджанага пляну. Капітальныя ўкладаньні ў гаспадарку складаюць 64,6 мрд. руб. Па паасобных галінах гаспадаркі гэтыя ўкладаньні разьбіваюцца наступным чынам; у прамысловасьць—16,4 млр. руб., у сельскую гаспадарку—23,2 млр. руб., транспарт—10 млр. руб., электрафікацыя—3,1 млр. руб.

Каб зразумець сутнасьць гэтых лічбаў, досыць параўнаць з лічбамі мінулай пяцігодкі, а менавіта: за мінулае пяцігодзьдзе капітальныя ўкладаньні складалі 26,5 млр. руб., з якіх у прамысловасьць—4,4 млр. руб., у сельскую гаспадарку—15 млр. руб., транспарт—2,7 млр. руб., электрафікацыя—0,9 млр. руб. Мы бачым, што па капітальным укладаньні будзе перавышэньне ў два з паловаю разы, па прамысловасьці—ў 4 разы, сельскай гаспадаркі—у паўтара разы, па транспарту—у 4 з палов. разы, па электрафікацыі—у 3 з палов. разы.

Успамінаючы пражытыя намі 5 год, мы павінны прызнаць, што наша разьвіцьцё ішло надзвычайна буйным тэмпам. Лічбы зацьверджанай пяцігодкі паказваюць, што гэты тэмп яшчэ больш узмацняецца.

Тав. Чарвякоў падаў тут яшчэ цэлы шэраг лічбаў, якія характарызуюць рост прадукцыі і г. д.

Тав. Чарвякоў спыніўся на пытаньні аб энэргетычнай базе, разьвіцьці электрабудаўніцтва, хімічнай прамысловасьці і г. д.

Далей, тав. Чарвякоў зазначыў, што на падставе выкананьня пяцігодкі мы дабʼёмся значнага росту сацыялістычнага сэктару ўсёй нашай гаспадаркі, які ў некаторых галінах будзе адыгрываць пераважную ролю.

Вытворчае каапэраваньне вывядзе вёску з стану жабрацтва.

Дакладчык зьвярнуў увагу Савету на пытаньні разьвіцьця сельскай гаспадаркі і каапэраваньня вёскі.

— V-ты Зьезд Саветаў,— кажа тав. Чарвякоў,—яшчэ раз разабраў пытаньне аб шляхох, па якіх можа ісьці разьвіцьцё сельскай гаспадаркі. Гэтым шляхам можа быць або капіталістычны, або сацыялістычны.

Капіталістычны шлях нясе зруйнаваньне многіх мільёнаў бяднацкіх і серадняцкіх гаспадарак, прыводзіць да ўтварэньня капіталістычных сялянскіх гаспадарак, пабудаваных на эксплёатацыі вясковай беднаты. „Адзін пануе, а сто бядуе"—вось адзнака капіталістычнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі.

Другі шлях—сацыялістычны, калі ўся маса бяднацкіх і серадняцкіх гаспадарак на падставе вытворчага каапэраваньня і вытворчай змычкі сацыялістычнай прамысловасьці пачынае ўзьнімацца і забясьпечвае дабрабыт усяе бяднацкае і серадняцкае масы.

V-ты зьезд саветаў выразна сказаў усяму сялянству, што мы павінны выбраць шлях сацыялістычны, і што для гэтага нам трэба ўзмацніць і шырэй разгарнуць справу каапэраваньня вёскі.

Спыніўшыся на пытаньні аб тым, што прадугледжваецца пяцігодкай для разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры Беларусі, т. Чарвякоў сказаў, што пяцігодка Беларусі складзена з надзвычайнай напружанасьцю. Па гэтаму пляну прадугледжваецца досыць буйны рост прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, культурнага будаўніцтва БССР. Беларускі ўрад, выходзячы з асаблівасьцяй БССР, склаў свой плян са значным перавышэньнем матар'яльных магчымасьцяй Савецкай Беларусі. З агульнай сумы звыш 800 млн. руб. па пяцігоды прадугледжваецца звыш 200 млн. руб. дапамогі з боку саюзнага Ўраду. Трэба адзначыць тое, што каб увесьці ў пяцігодку ўсеагульнае навучаньне ў БССР, нам патрэбна дапамога з боку саюзнага Ўраду ня менш 50 млн. руб.

Ці зможам мы гэтыя пляны выканаць? Вопыт мінулага паказвае, што самыя напружаныя пляны ў працэсе іх выкананьня аказваюцца пасільнымі для савецкай краіны.

Мы ўпэўнены ў тым, што і гэты плян мы выканаем з посьпехам. Аднак, для гэтага патрэбен самы шырокі ўдзел у выкананьні пяцігодкі працоўных мас гораду і вёскі.

Зьезд Саветаў адзначыў, што посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва на сучаснай ступені няўхільна абвастраюць клясавую барацьбу. Наша будаўніцтва сустракае ўпартае супраціўленьне з боку капіталістычных элемэнтаў. Мы павінны весьці рашучую барацьбу з нашым ворагам і ўсімі мерамі перамагаць малейшыя хістаньні ў шэрагах рабочай клясы і сялянства.

Закрануўшы пытаньне аб чыстцы савецкага апарату, т. Чарвякоў сказаў:

— Мы павінны ачысьціць апарат ад шкодных элемэнтаў. Мы павінны выправіць тыя часьці апарату, якія пачалі псавацца ў працэсе работы. Мы павінны аднавіць апарат новымі сіламі.

Кожны з нас,—кажа далей т. Чарвякоў,—дзе-б ён ні быў, павінен ведаць пастанову 5-га зьезду саветаў якая гаворыць наступнае: Усесаюзны зьезд саветаў заклікае ўсіх працоўных гораду і вёскі, усіх спэцыялістаў напружыць усе свае сілы для поўнага правядзеньня ў жыцьцё ўсіх вызначаных зьездам мерапрыёмстваў.

У заключэньне тав. Чарвякоў выказаў цьвёрдую надзею, што Менскі Савет, як Цэнтральны Гарадзкі Савет Савецкай Беларусі, будзе стаяць у першых шэрагах пры выкананьні пастаноў 5-га Усесаюзнага Зьезду Саветаў.

Што пастанавіў гарадзкі савет.

Па дакладу тав. Чарвякова Пленум Менскага Гарадзкога Савету вынес рэзалюцыю, у якой канстатуе, што Зьезд Саветаў вырашыў усе пытаньні з поўнай адпаведнасьцю і задачамі, якія пастаўлены Камуністычнай партыяй і запатрабаваньнямі працоўных мас.

Пленум—гаворыцца далей у рэзалюцыі—падкрэсьлівае правільнае вырашэньне зьездам пытаньня замежнай палітыкі Ўраду СССР, якая да гэтага часу ўзмацняла мірныя пазіцыі СССР.

Пленум з асаблівым здавальненьнем зазначае, што 5-ты Усесаюзны Зьезд Саветаў усю сваю увагу аддаў пытаньням сацыялістычнага будаўніцтва СССР.

Прыняты зьездам пяцігадовы плян поўнасьцю адпавядае задачам эканамічнай палітыкі савецкай улады і прадугледжвае далейшы ўздым матар'яльнага і культурнага ўзроўню працоўных мас, гаспадарчы і культурны ўздым нацыянальных рэспублік і адсталых краін, узмацненьне саюзу рабочае кляса з працоўнымі масамі сялянства і тым самым умацоўвае палітычныя і эканамічныя пазіцыі савецкай улады ў яе барацьбе з клясавымі ворагамі.

Пасьпяховае правядзеньне ў жыцьцё рашэньняў зьезду патрабуе ад працоўных мас яшчэ большай згуртаванасьці і напружанасьці працы па ажыцьцяўленьні галоўных задач партыі і ўраду шляхам арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва паміж прадпрыёмствамі на лепшую вытворчасьць працы, працдысцыпліну.

Улічваючы вялікае значэньне прынятай зьездам пяцігодкі, пленум лічыць патрэбным увесьці вывучэньне пяцігодкі ў школах.

Пленум даручае дэпутатам савету правесьці растлумачальную працу на прадпрыёмствах сярод працоўных аб рашэньнях 5-га Усесаюзнага Зьезду Саветаў.

Пленум упэўнен у тым, што практычнае ажыцьцяўленьне рашэньняў зьезду будзе мець поўнае падтрыманьне з боку працоўных Менску.

Пленум пастанавіў насласць прывітаньне Саюзнаму Ўраду.

Нямецкія фашысты запрадаліся Францыі.

Нямеччына ўцягнута ў антысавецкі блёк

БЭРЛІН. Левая газэта «Вэльт ам Абэнд» зьмяшчае выкрыцьці свайго па рыскага карэспандэнта аб перамовах, якія адбываліся закулісамі рэпарацыйнае канфэрэнцыі. Справа ідзе пра вядомага ідэалёга антысавецкага блёку Рэхбэрга, а таксама Кюльмана, які быў таварышом апошняга міністра замежных спраў пры Вільгельме. Абодвы яны праводзілі ў Парыжы перамовы з прадстаўнікамі розных дзяржаў аб устанаўленьні адзінага фронту проці СССР у фінансавых, палітычных і ваенных адносінах.

Поруч з гэтым падрыхтоўвалася гле ба ў пытаньні аб надзяленьні Нямеччыны калёніямі ў абмен на яе ўдзел у антысавецкім блёку. Між іншым Кюльман высунуў ідэю перадачы Нямеччыне гішпанскае часткі Марока.

Парыскія перамовы Рэхбэрта і Кюльмана зьявіліся тэмаю запытаньня, якое камуніст Штэкер падаў ураду 4-га чэрвеня на вачыненым пасяджэньні замежнае камісіі рэйхстагу. Штэкер запытаў, ці браў дырэктар рэйхсбанку Шахт, які прадстаўляе Нямеччыну на рэпарацыйнай канфэрэнцыі, удзел у перамовах Рэхбэрта.

Як паведамляе левая газэта «Бэрлін ам Морген», рэйхсканцлер Мюльлер адказаў, што ўраду пра гэта нічога не вядома, але, што ён ня можа па ручыцца, што гэтага ня было.

РЭПАРАЦЫІ—НА ПЛЕЧЫ НЯМЕЦКІХ РАБОЧЫХ

Скараціць дапамогу па беспрацоўі патрабуюць нямецкія прамыслоўцы.

БЭРЛІН, 6-6. Міністр народнае гаспадаркі Курцыс (член нямецкае народнае партыі) абвясьціў учора ў рэйхстазе, што пасьля сканчэньня рэпарацыйнае канфэрэнцыі нямецкі ўрад падасьць у рэйхстаг праэкт шырокае праграмы рэформ з мэтаю палегчыць становішча нямецкае гаспадаркі.

«Дзякуючы сацыяльнаму страхаваньню беспрацоўных,—заявіў міністр,—нарушаны ва ўсіх галінах асновы працоўнае маралі. З гэтае прычыны трэба грунтоўна пераглядзець страхаваньне ад беспрацоўя, а для гэтага трэба распачаць не з павялічэньня страхавых узносаў, а са скарачэньня колькасьці застрахаваных».

Гэтая заява міністра члена народнае партыі—выклікала ў радох сацыял-дэмакратаў вялікае зьдзіўленьне. Справа ў тым, што надоечы на магдэбурскім зьезьдзе сацыял-дэмакратычнае партыі правадыры сацыял-дэмакратыі выступалі з салодка-радыкальнымі прамовамі аб тым, што яны не дапушчаюць і думкі аб пагоршаньні сацыяльнага страхаваньня беспрацоўных.

ПРАСЬЛЕДВАНЬНЕ ЛЕВАЙ АПАЗІЦЫІ.

БЭРЛІН. 4-6. Папулярны правадыр левай апазіцыі ў нямецкім саюзе мэталёўцаў Пауль Пэшке выключан рэфармістамі з членаў саюзу, у якім ён быў у працягу 21 году. Падставаю для выключэньня Пэшке быў яго становішчы адказ на запытаньне, ці адабрае ён пазіцыю камуністаў у пытаньнях аб выбарах фабрычна-заводзкіх мясцкомаў і эканамічнай барацьбе.

АДНАДУШНА ЎХВАЛІЛІ ТЭЗІСЫ ЦК.

БЭРЛІН. Пленарнае пасяджэньне акруговага праўленьня арганізацыі кампартыі Прыморскае вобласьці ўхваліла рэзалюцыю аб майскіх падзеях і палітычным становішчы. Рэзалюцыя, ухваленая аднагодна, цалкам далучаецца да тэзісаў ЦК партыі і да рэзалюцый бэрлінскага камітэту партыі пакент майскіх падзей.

Рабочы ўрад у Англіі.

ЗА ЗАСНАВАНЬНЕ НАРМАЛЬНЫХ ЗНОСІН З СССР

ЛЁНДАН, 6-VI. Генэральны орган фінансавых колаў „Фінаншэль Ньюс", прызнае пажаданым аднаўленьне англа-савецкіх дыплёматычных зносін і заяўляе, што перад гэтым павінна быць дасягнута „задавальняючая згода" па пытаньні аб царскіх даўгох.

Лібэральная «Манчэстэр Гардыян», наадварот, лічыць, што Макдональд павінен неадкладна аднавіць нармальныя зносіны з СССР. Газэта піша: Савецкіх дыплёматаў трэба сустракаць у Англіі на тых самых умовах, як і дыплёматаў кожнае іншае краіны.

Няма ніякіх падстаў для якога-не будзь торгу. Пытаньне аб наданьні пазыкі СССР павінна разглядацца выключна па сутнасьці камэрцыйнага, а не палітычнага пункту гледжаньня. Зусім лішні які-небудзь угавор ці згода, якія абавязваюць СССР ня ўмешвацца ў нашы ўнутраныя справы».

„Манчэстэр Гардыян" заяўляе, што новы ўрад павінен неадкладна адклікаць ангельскае акупацыйнае войска з Рэйнскае вобласьці. „Гэта будзе азначаць,—піша газэта,—пачатак новага курсу замежнае палітыкі і зьявіцца сыгналам натхненьня для прыцяляў міру ва ўсіх краінах". Далей, газэта падкрэсьлівае, што адзінае супрацоўніцтва, якое магчыма для Англіі, гэта англа-амэрыканская Антанта.

Калі-ж буржуазныя газэты закранаюць пытаньне аб становішчы горнае прамысловасьці, дык яны бадай што пераходзяць да непасрэдных пагроз, заяўляючы, што «кожная спроба аднавіць 7-мі гадзінны дзень працы пад зямлёю выкліча катастрофу».

РАБОЧАЯ ПАРТЫЯ АНГЛІІ РЭВАЛЮЦЫІ НЯ ЗРОБІЦЬ.

РЫМ, 6-6. Італьянскі фашысцкі друк, які пасьля першых паведамленьняў аб перамозе рабочае партыі на ангельскіх выбарах выказваў некаторую трывогу, зараз супакоіўся, упэўнены, што рабочая партыя рэвалюцыі ня зробіць, а зьмены замежнае палітыкі Англіі павінна баяцца больш Францыя, чымся Італія.

Наконт пытаньня аб англа-савецкіх адносінах газэта піша: «Нікому не пашкодзіць аднаўленьне англа-савецкіх зносін. СССР зьяўляецца вельмі значнай рэальнай сілай, каб на яго можна было проста не зьвярнуць увагі».

Макдональду раяць „кратацца" памаленьку.

ЛЁНДАН. 6-6. Ангельскі буржуазны друк ня спыняе кідаць салодкія словы на адрас ураду рабочае партыі, заяўляючы, што яму «сумленна даецца магчымасьць» выявіць сваю дзейнасьць. Аднак, у газэтных перадавіцах выразна чуецца тон грознае перасьцярогі Макдональду, якому раяць „кратацца памаленьку і дзейнічаць з вялікаю памеркаванасьцю".

ЯЩЧЭ АДНА АПЛЯВУХА ПОЛЬСКАМУ СОЙМУ.

„ПАГАНЫ СОЙМ НЯ МОЖА ВЫРАШАЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫХ СПРАЎ".

ВАРШАВА, 6-VI. Скончылася дазнаньне па справе ранейшага міністра фінансаў Чэховіча, аддадзенага пад суд вярхоўнага трыбуналу за перавыдатак 560-ці мілёнаў злотых бяз ведама сойму.

Пілсудзкі, які адмовіўся выступаць сьведкаю па гэтай справе, зьвярнуўся да вярхоўнага трыбуналу з лістом. У ім Пілсудзкі зазначае, што «ён» лічыў першы сойм „зусім разваленым і нявартым вырашаць важныя дзяржаўныя пытаньні". За гэтым ён не падаваў выдатку на зацьверджаньне. Пілсудзкі адзначае таксама, што новы сойм «ня менш паганы, чымся ранейшы».

Пілсудзкі забараніў Бартэлю і Чэховічу падаваць перавыдатак на зацьверджаньне сайму, бо лічыў, што мець зносіны з соймам можа толькі ён, як тагочасны прэм'ер. Пілсудзкі прызнае, што не зварочваў увагі на зазначэньні аб парушэньні законаў.

8 мілёнаў злотых былі выдадзены ўрадам на выбары, а 5 мілёнаў Чэховіч патраціў згодна загаду Пілсудзкага, дадзенага яму ў пісьмовай форме.

ЛЬВОУСКІЯ ГРАМІЛЫ НЯ УНІМАЮЦЦА

УЧОРА ІЗНОЎ ПОЛЬСКІЯ СТУДЭНТЫ ЗЬБІВАЛІ ЯЎРЭЯЎ І ЗАКЛІКАЛІ ДА ПАГРОМУ УКРАІНЦАЎ

ВАРШАВА. 6-VI. Учора ў Львове адбылося некалькі студэнцкіх дэманстрацый з патрабаваньнем вызваліць студэнтаў-грамія, арыштаваных за ўдзел у яўрэйскім пагроме. Як паведамляе бундаўская „Фольксцэйтунг", дэманстранты несьлі плякаты з заклікам зьбіваць ня толькі яўрэяў, але і украінцаў „у імя выратаваньня Польшчы».

Дэманстранты ў арганізаваным парадку гулялі па горадзе на працягу 2-х гадзін, зьбіваючы яўрэяў, якія трапляліся ім па дарозе.

Прафэсары Львоўскага унівэрсытэту зьвярнуліся да саюзу праваабаронцаў з прапановаю ўзяць на сябе абарону арыштаваных грамія. Саюз праваабаронцаў адмовіўся ад гэтага.

Яўрэйскія грамадзкія арганізацыі ў Львове ахоўваюцца паліцэйскімі патрулямі. Яўрэйскае насельніцтва баіцца паўтарэньня пагромаў.

„Газэта Варшавска" цалкам далучаецца да грамія. Пілсудчыкі ўсімі спосабамі імкнуцца адмежавацца ад львоўскіх падзей і заяўляюць, што яны былі справакаваны „ворагамі дзяржавы, якія хацелі дыскрэдытаваць Польшчу заграніцаю".

Арышт моладзі ў Любліне.

ВАРШАВА, 5-6. Згодна паведамленьня польскага тэлеграфнага агенцтва, члены нелегальнага польскага камсамолу застрэлілі ў Любліне на вуліцы прыватара, які выдаў паліцыі некалькіх камсамольцаў. У зьвязку з гэтым у Любліне паліцыя арыштавала шмат маладых рабочых.

* * *

ВАРШАВА, 5-6. Правы апазіцыйны друк, зьмяшчаючы афіцыёзнае паведамленьне аб пратэсьце паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Варшаве т. Багамолава проці ўдзелу польскіх афіцыйных асоб у сьвяткаваньні „10-х угодак абвяшчэньня меншавіцкае Грузіі", прапушчае частку паведамленьня наконт польска-нятлярайскага ваеннага саюзу. Орган эн-дэкаў „Газэта Варшавска" зусім не зьмясьціў гэтага паведамленьня.

Лепш зрабіць буржуазную справу рукамі „рабочае" партыі.

У Англіі прышоў да ўлады рабочы ўрад. На чале рабочага ўраду стаў адзін з самых буйных лідэраў II Інтэрнацыяналу. А біржа зусім спакойна. Банкі ня ўстрывожаны нэрспэктываю ўраду „рабочай партыі" («Таймс»). Гэта вельмі добрадзейны, абыходлівы, салённы „сацыяліст", які кіруючае клясы не забывае.

„Карона зьяўляецца сымбалем усяго народу",—заяўляе афіцыйны орган рабочае партыі «Дэйлі Геральд», бо ён бачыць надзвычайную пашану да яе і вернападданіцкія пачуцьці.

І верны лепшым традыцыям ангельскага манархічнага рытуалу, правадыр «рабочай партыі", прымаючы даручэньне скласьці габінэт, пачціва цалуе манархіі руку.

Ні што не пагражае з боку новай кіруючай партыі Вялікабрытанскай імпэрыі, якая сымбалізуецца тэю самаю „каронаю" Вялікабрытанская імпэрыя, пабудаваная на эксплёатацыі пралетарыяту, мэтраполіі і рабунку сотняў мілёнаў калёніяльных нявольнікаў-індусаў, эгіцян арабаў, нэграў, імпэрыя, якая адыгрывае ролю сусьветнага жандара, найменавана ў праграме гэтай партыі II інтэрнацыяналу «садружаствам» нацый.

І няхай толькі паспрабуе які-небудзь прыгнечаны народ пакінуць гэтае „садружаства": Макдональд заговарыць з ім моваю ультыматуму, як у 1724 годзе гаварыў ужо з Індыяй і Эгіптам, а калі патрэбна будзе, —дык і моваю гармат і бамбамётаў.

Непарушнасьць прыватнае ўласнасьці і ўсёй сыстэмы эксплёатацыі чалавека чалавекам, непарушнасьць імпэрыі—вось асноўнае і рашаючае ў праграме няшчырай рабочай партыі, якая стала зараз ля руля ўлады ў Англіі. Недарэмна кансэрватыўная газэта «Дэйлі Тэлеграф» з насьмешлівай іроніяй піша пра Макдональда і яго супрацоўнікаў; „Яны досыць востра нападалі на ўрад і лібэралаў, але калі справа датычылася сацыялізму, дык іх голас ня гучэў вышэй шэпту».

Таксама францускае агенцтва „Ажанс Эканомік Фінансьер", супакойваючы біржавыя колы, гаворыць, што „новы вопыт сацыялізму, разбаўлены ружовай вадзічкаю, не зьяўляецца пагражаючым".

У інтарэсах буржуазіі патрэбна рашучая, няшчадная рацыяналізацыя прамысловасьці капіталістычнымі мэтадамі і зьніжэньне сабекошту за кошт далейшага зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню пралетарыяту. Пры сучасных настроях ангельскага рабочага такі паварот пагражае буржуазіі небясьпекай.

Вось чаму частка яе стала прытрымлівацца погляду, што лепш перадаць лейцы часова Макдональду, лепш зрабіць буржуазную справу рукамі «рабочае» партыі. Гэтую місію Макдональд і Сітрын на сябе з ахвотаю ўскладаюць. Лібэральная буржуазія пры гэтым, аднак, думае, што, калі Макдональд зробіць сваю справу, дык яму можна будзе запрапанаваць падацца ў адстаўку.

Мілёны рабочых, якія доўгія гады знаходзіліся ў палоне самай рэакцыйнай партыі ангельскай буржуазіі—кансэрватараў,—ад яе адыходзяць. Гэта—факт буйнага палітычнага значэньня. Можна прадбачыць, што падобна 1924 году мы зноў у Англіі у выніку прыходу да ўлады фальшывага рабочага ўраду ўбачым некаторы ўздым актыўнасьці рабочае клясы. Сюды далучаецца магчымае аднаўленьне зносін з СССР, на што раней ці позьней згадзіўся-б і чыста буржуазны ўрад Англіі. У кожным разе, пасьля навучаньня на другім курсе макдональдаўшчыны, ангельскі пралетарыят будзе больш сьвядомым, чымся пасьля вывучэньня кароткатэрміновага першага курсу.

П.

КРЫВАВЫЯ СУТЫЧКІ БЕСПРАЦОУНЫХ З ПАЛІЦЫЯЙ.

ВАРШАВА, 6-VI. У Жырардаве перад памяшканьнем магістрату каля тысячы беспрацоўных патрабавалі аднаўленьня дапамогі. Не атрымаўшы здавальняючага адказу, дэманстранты спрабавалі ўвайсьці ў памяшканьне біржы працы, але былі разагнаны паліцыяй.

У БУРЖУАЗНАЙ ФРАНЦЫІ.

Сур'ёзная перасьцярога францускаму ўраду.

ПАРЫЖ, 5-6. Адбыўся мітынг парыскіх паштавікоў, на якім быў прызнаны посьпех аднадзённае забастоўкі пратэсту. На мітынгу ўхвалена пастанова распачаць працу і падрыхтавацца да адпору супроць надыходзячых рэпрэсій з боку ўраду, а таксама ня спыняць барацьбы за ўстанаўленьне мінімальнага заработку.

Унітарная фэдэрацыя паштова-тэлеграфных служачых агаласіла ліст да працаўнікоў сувязі, у якім падкрэсьлівае, што посьпех забастоўкі зьяўляецца сур'ёзнаю перасьцярогаю на адрасе адміністрацыі і ўраду.

Рэфармісцкая фэдэрацыя паштавікоў агаласіла заяву, у якой рашуча адмяжоўваецца ад удзельнікаў забастоўкі і востра ганьбіць тых рэфармістаў, якія прымалі ўдзел у камітэтах дзеяньня.

Ацэньваючы рух паштавікоў, орган кампартыі „Юманіта" падкрэсьлівае, што апошнія забастоўкі сьведчаць аб пачатку агульнае барацьбы ўсіх дзяржаўных служачых проці рацыяналізацыі і нізкага заработку. Водгук слоў газэты, гэтыя забастоўкі наносяць рашучы ўдар аўтарытэту дзяржавы і сьведчаць аб узросшай актыўнасьці дзяржаўных служачых, якія да гэтага часу спадзяваліся, што стабілізацыя францу палепшыць іх становішча.

Кампартыя ня страціла сваіх пазіцый.

ПАРЫЖ, 3-6. У другім туры перагаласаваньня выбараў у генэральную раду Сэнскага дэпартаманту намецілася гэткі склад рады: камуністаў—5 (бяз зьмен), сацыял-камуністаў (прыхільнікаў Фросара) — 4, сацыялістаў —9 (было 10), незалежных сацыялістаў—3, (было 4), радыкал-сацыялістаў—3 (бяз зьмен), рэспубліканскіх радыкалаў—8 (бяз зьмен), членаў рэспубліканска-дэмакратычнага саюзу —1 (бяз зьм

У Саюзе ССР.

ЗНАЧЭНЬНЕ ДАГАВОРУ З ФОРДАМ.

МАСКВА, 6-6. Сутнасьць дагавору з Фордам шчыльна зьвязана з намечанаю праграмаю пабудовы ніжагародзкага аўтамабільнага заводу. Завод павінен выпусьціць у 1930-31 годзе 24 тысячы машын, у 1932-33 годзе--48000 машын, у 1933-34 годзе--100 тысяч машын.

Грунтуючыся на гэтай праграме, мы атрымаем ад Форда наступную колькасьць частак машын: за першыя 2 гады ён дае цалкам увесь камплект частак, якія ў нас будуць зьбірацца, на трэці год--50 проц., па чацьверты —25 проц. Ад першага году наступнае пяцігодкі машыны будуць зьбірацца разам з частак, поўнасьцю зробленых у Саюзе.

Дагавор з Фордам зьяўляецца адным з самых буйных дагавораў і можа раўнацца па сваім значэньні толькі з дагаворам «Джэнэраль-Электрык». Дагавор з Фордам сьведчыць, што ня толькі самая буйная электра-тэхнічная фірма Амэрыкі, але і самая буйная аўтамабільная фірма ідзе працаваць у Савецкі Саюз. Новы аўтазавод у СССР будзе па сваёй магутнасьці другім ці трэцім у сьвеце.

СПРОБНЫ ПРАБЕГ АЎТАМАШЫН ПА МАРШРУТУ МАСКВА—НІЖНІ-НОЎГАРАД—МАСКВА.

МАСКВА, 6-6. У зьвязку з пабудовай аўтамабільнага заводу ў Ніжнім-Ноўгарадзе маскоўскі аўтаклюб наладжвае параўнаўчы спробны прабег машын Форда па маршруту Масква—Ніжні-Ноўгарад—Масква, на 850 кілёмэтраў. Адначасна прабег праводзіцца над лёзунгам агітацыі за заснаваньне аўтамагістралі.

Найбольш багата будуць прадстаўлены самыя новыя мадэлі машын Форда: „Намі", «Сірэна», „Татра". З грузавых машын, апроч мадэляў Форда будуць удзельнічаць „Шэўрале", „АМО", «Крэў» і інш. У часе прабегу будзе параўноўвацца дынаміка, эканамічнасьць і моцнасьць.

Апроч машын Форда, якія ўдзельнічаюць у прабегу, зварачвае на сябе ўвагу новы савецкі аўтамабіль Яраслаўскага заводу „Я 5" з маторам „Геркулес". Старт прабегу назначан на 22-га чэрвеня.

ПАДРЫХТУЕМ КАДРЫ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ ДЛЯ ВЁСКІ.

МАСКВА, 6-6. Пленум ЦК саюзу сельска-гаспадарчых рабочых заслухаў некалькі дакладаў аб працы старых савгасаў. У сёлетнім гаспадарчым годзе ў савгасах, якія злучаюцца трэстам, уводзяцца выключныя чыстагатунковыя засевы, пашыраецца карыстаньне мінэральнымі ўгнаеньнямі, павялічваецца абшар вапнаваньня глебы, уводзіцца правільны севазварот і г. д.

Усе гэтыя мерапрыёмствы разам з мэханізацыяй вытворчасьці павінны забясьпечыць павялічэньне ўраджайнасьці ў сярэднім на 60 проц. Для падрыхтоўкі належнай рабочай сілы сельска-гаспадарчы трэст адчыняе ў 1929-30 годзе 20 школ для сельска-гаспадарчага вучнёўства.

ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ ВЫТВОРЧЫХ НАРАД.

НК РСІ СССР зьвярнуўся ў Савет Працы і Абароны з дакладнаю запіскаю, у якой просіць США выдаць закон з дакладным вызначэньнем правоў і абавязкаў вытворчых нарад рабочых і служачых, а таксама з абавязацельствам для гаспадарчых органаў выконваць ухваленыя прапановы вытворчых нарад і асобных рабочых і служачых.

НК РСІ зазначае, што актыўнасьць і ініцыятыва рабочых на фабрыках, заводах і капальнях выкарыстоўваецца слаба. Тысячы каштоўных прапаноў ляжыць на працягу гадоў без выкарыстаньня. Тлумачыцца гэта ня толькі недалікамі ў працы саміх вытворчых нарад, але і, пераважна, няўважлівымі адносінамі гаспадарцаў да выкананьня пастаноў.

Усе прапановы вытворчых нарад, прызнаныя тэхнічна мэтазгоднымі і эканамічна выгаднымі, гаспадарчыя органы павінны ўключыць у пляны рацыяналізацыі прадпрыёмстваў. **За своячасное выкананьне прапаноў вытворчых нарад дырэктар прадпрыёмства павінен несьці асабовую адказнасьць.**

ДАПАМОГА АХВЯРАМ ПЕРШАМАЙСКІХ ПАДЗЕЙ.

МАСКВА, 6-VI. ЦК МОПР'у перавёў у ЦК нямецкае чырвонае дапамогі 20 тысяч рублёў на дапамогу ахвярам берлінскае першамайскае расправы і іх сям'ям.

СУД НАД ФІНСКІМІ ШПІЁНАМІ.

ЛЕНІНГРАД, 6-6. Сёньня ў ваенным трыбунале Ленінградзкага Ваеннага Округу скончыўся разгляд справы фінскай зграі шпіёнаў-кантрабандыстаў. У апошнім слове абвінавачаныя прасілі даравацъ ім віну. Ваенны трыбунал засудзіў 4-х на 8 гадоў пазбаўленьня волі з суровым адмежаваньнем, адабраньнем маемасьці і пазбаўленьнем правоў на 5 гадоў.

ПЕРАЛОМ У ХЛЕБАЗАГАТОЎКАХ.

АРЦЁМАЎСК, 6-6. Наглядаецца востры пералом у хлебазагатоўках. За мінулую пяцідзёвку чэрвеня загатоўлена 1.300 тон. У некаторых вёсках Жалязьнянскага раёну толькі за 2 дні выкрыта ў сялян больш за 500 цэнтнэраў схаванага хлеба.

ДОБРЫЯ ВЫНІКІ 7-МІГАДЗІННАГА ДНЮ ПРАЦЫ.

БАКУ, 6-VI. Саюз горнарабочых абсьледаваў вынікі пераходу Азнафты на 7-мігадзінны дзень працы. Абсьледаваньне паказала значныя посьпехі ад скарачэньня дню працы: **прадукцыйнасьць працы ўзрасла да 40 проц., заработак павялічыўся ў сярэднім на 12 проц., а сабекошт прадукцыі зьнізіўся на 20 проц.**

БУДЗЕ ДОБРЫ ЎРАДЖАЙ.

ПАЛТАВА. 6-6. Стан ярыны ў акрузе добры. У апошнія дні прайшлі дажджы, пасьля чаго настала ясное цёплае надвор'е.

* * *

АРЦЁМАЎСК, 6-6. Хлеб расьце ў спрыяючых кліматычных умовах. Пэрыядычна ідуць дажджы.

* * *

КІЕЎ, 6-6. Засеў ярыны хутка скончыцца. Пшаніца ацэньваецца ў 3,2 балы, а —жыта—у 3,3.

* * *

КАМЯНЕЦ, 6-6. Стан азіміны ацэньваецца ў 3,3 балы. Усходы раньняе ярыны здавальняючыя.

Зноў бандыты з Польшчы перайшлі ў Літву.

КОЎНЯ, 6-6. Афіцыёз «Летувос Айдас» паведамляе, што ў сераду ўвечары група асоб, узброеных рэвальвэрамі і гранатамі, перайшла з Польшчы праз літоўскую мяжу. За 200 мэтраў ад мяжы перайшоўшыя распачалі страляніну супроць літоўскіх паліцэйскіх і кінулі гранату, якая, аднак, ня выбухнула.

Калі на месца сутычкі прыехалі новыя паліцэйскія сілы і распачалі страляніну ў адказ, дык група пасьпяшыла ўцячы. У прылеглым лесе знойдзены дзьве «адскіе» машыны. Думаюць, што група бандытаў складалася з тэрарыстаў, якія хацелі прайсьці ў Літву.

Гаспадарчы крызіс і голад у Бэсарабіі.

ВЕНА. Цяжкі эканамічны крызіс у Бэсарабіі адбіваецца таксама на стане гандлю віном і садавінаю, якія зьяўляюцца галоўнаю крыніцаю багацьця гэтае правінцыі. Перад вайною выраб віна ў Бэсарабіі дасягаў 800 міл. лей.

З прычыны гвалтоўнага адлучэньня Бэсарабіі ад СССР гэтая галіна вытворчасьці страціла рынак збыту. Апошняе выступленьне бэсарабскіх купцоў за аднаўленьне зносін з СССР тлумачыцца іменна безнадзейным эканамічным становішчам Бэсарабіі і пануючым там голадам.

ПРАВЕРКА КІРУЮЧЫХ КАДРАЎ КП(б)Б.

„Партыя мяне паставіла працаваць—і я працую".

У чацьвер, 6 чэрвеня яклюб Карла Маркса перапоўнен. У залі больш 500 чалавек. Акрамя куставога сходу ячэяк: заводу „Пралетары", БДУ, абутковай фабрыкі, шчаціннай фабрыкі, ЦКК РСІ, Саматужна-Прамысловага Саюзу, на чыстку кіруючых таварышоў партыі прышло шмат беспартыйных.

Старшыня Камісіі тав. Герасімаў адчыняе сход.

Пасьля ўступнага слова камісія прыступае да выкліку правяраемых таварышоў.

Першым на сцэну выходзіць тав. **Валынец**, член партыі з 1912 г., беларус, паходзіць з сялян, сам рабочы. Быў у старой арміі. У Чырвонай арміі быў камандзірам атраду. Зараз член ЦКК КП(б)Б.

Расказваньне сваёй біаграфіі ў таварыша Валынца выходзіць апавяданьнем з гісторыі барацьбы рабочых і сялян пад кіраўніцтвам партыі за савецкую ўладу.

— Прымаў актыўны ўдзел у разбросеньні контрэвалюцыйных эшалёнаў, якія рухаліся на Маскву, прымаў удзел у зьнішчэньні контрэвалюцыйнага паўстаньня ў Смаленскай губэрні. Камандаваў асобным атрадам супроць Дзянікіна. Быў паранены ў бойках.

Таварышу задаюць пытаньні:

— Што рабіў у партыі да рэвалюцыі?

І ён адказвае: працаваў у друкарні падпольна, раскідаў праклямацыі, за што быў арыштаваны і сядзеў у турме ў горадзе Ломжы, адкуль сам паходзіць і дае ўступіў у партыю.

Другім правяраецца тав. **Вінагра** аў. Член партыі з 1914 году. Сын папа. Вялікарус. Служачы. Быў у арміі. Зараз працуе ў ЦКК.

Выступаючыя кажуць, што ён няпрымірыма адносіцца да ўсялякіх ухілаў ад лініі партыі.

Выходзіць на трыбуну тав. **Дамброўскі**. У партыі з 1909 году. Рабочы-токар на мэталю. Па нацыянальнасьці латыш. Быў у Чырвонай гвардыі і Чырвонай арміі. Зараз старшыня АКК. Тав. Дамброўскі аб сабе расказвае:

— Бацька працаваў мэталістам 40 гадоў. Сам я працаваў 11 гадоў. Арганізоўваў Чырвоную гвардыю. Удзельнічаў у Ленінградзе ў Кастрычнікавым паўстаньні. Сувімаў контррэвалюцыю. Быў у эміграцыі ў Амэрыцы і працаваў там у латыскай сэкцыі.

Пасьля скончэньня расказу раздаліся гучныя воплескі прысутных.

— У каго будуць пытаньні?—пытае старшыня.

— Аплёдысмэнты гаварацъ!—адказвае заля.

Тав. **Каменштэйн**. У партыі з 1918 году. Ярэй. Рабочы-красільшчык. Быў у Чырвонай арміі. Быў у „Бундзе". Зараз старшыня Ц. П. Мэдсанпрацы і кандыдат у члены ЦК КП(б)Б. Ён расказвае:

— Будучы у Чырвонай арміі, я навучыўся расейскай мове. Да гэтага працаваў на яўрэйскай і ніколі ня ведаў расейскай мовы.

На пытаньне: чаму ён доўга быў у „Бундзе", тав. Каменштэйн адказвае:

— Я ніколі ня чытаў літаратуры на расейскай мове і таму ня мог так разьбірацца. А на яўрэйскай буліцы працаваў выключна „Бунд". Вось туды і ішлі ўсе.

Затым чытаюць анкету т. **Крэмэр**. У партыі з 1920 году. Служачая. Яўрэйка. Зараз загадчыца жанаддзелу ЦК КП(б)Б.

Выходзіць на трыбуну т. **Каўцераў**. У партыі з 1906 году. Беларус. Селянін. Член ЦКК КП(б)Б.

Т. Каўцераў расказвае сваю біаграфію. Да 1917 г. працаваў батраком у абшарніка. Быў на ўсякіх іншых чорных работах. Працаваў сярод сялянства і з сялянствам. У 1905 г. удзельнічаў у забастоўцы на віцебскім трамваі. Быў у 1906 г. арыштаваны і вышаў з турмы толькі ў 1911 г. У старой арміі быў пад наглядам да самай Лютаўскай рэвалюцыі. Потым—старшыня палкавога камітэту. Прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху.

Выходзіць т. **Кушнэроў**. У партыі з 1919 году. Беларус. Працаваў у сельскай гаспадарцы батраком. Быў дабраахвотнікам у Чырвонай арміі з 1918 г. Вылучэнец у гандльаддзел Белсампрамсаюзу.

— Вы ўступілі ў партыю ў партыйны тыдзень?

— Дапамагаюць вам у працы?

— Дагэтуль няма „задвіжэньняў"?

— Пакуль няма, а потым будзе відаць, —адказвае т. Кушнэроў.

На сцэну выходзіць т. **Кац**. З 1920 г. у партыі. Рабочы-шавец. Быў у старой арміі. Быў у „Бундзе".

Вось дзе рэвалюцыя Вялікага Кастрычніка яскрава паказвае свой твар. Ніколі ня было-б магчымым такое становішча ў жыцьці рабочага, як толькі ў савецкай краіне, дзе ля ўлады рабочая кляса. Няхай рабочая кляса Захаду бачыць, як у краіне саветаў да ўлады даходзяць самыя „нізы". Расказаць рабочым такі факт, як з т. Кацам—яны-б ніколі не паверылі. А такія факты ў нас былі.

— Чаму вы так доўга былі ў „Бундзе"?

— Я сваю няпісьменнасьць зьліквідаваў толькі будучы старшынёй менскага ЕПО. Ня выходзіў з „Бунду" таму, што ня чытаў літаратуру на расейскай мове. У 1918 г., калі „Бунд" раскалоўся на правы, цэнтр і левы.

— Якія ў вас былі цяжкасьці ў працы?

— Я быў няпісьменны. Але партыя мяне пасадзіла працаваць—і я працаваў. Мне далі пісьменнага сэкратара. Ён мне ўсё прачытваў і я яму толькі казаў: „да" альбо „нет". Я гаварыў, а ён пісаў. Вось так і працаваў.

Тут старшыня кажа:

— Сказалі-б аб гэтым факце за межамі—ніхто-б не паверыў, а тэта—факт.

— Кажуць, што ён шавец, але ў яго галава разумная,—выкрыкнуў хтосьці з залі.

На гэты выгук Герасімаў кажа:

— Па вашаму ўказаньню яго галава лепш чэмбэрленаўская?

У адказ—гучныя воплескі.

Потым праходзяць т. т. Палякоўскі, Лазоўскі.

У т. Стасэвіча пытаюць:

— Якая ў вас сувязь з рабочымі?

— Як была пастаўлена справа з самакрытыкай, калі вы працавалі ў Воршы?

* * *

Гэты сход сьведчыць, што рабочыя масы і ўся партыя добра зразумелі сэнс цяперашняй чысткі партыі.

Усё гэта сьведчыць, што беспартыйныя рабочыя лічаць чыстку партыі сваёй справай,—таму яны так цікавяцца і кожнага правяраемага пытаюць аб усім, што іх цікавіць.

Сёньняшняя чыстка—ня звычайная. Яна павінна высьветліць твар нашых кіруючых таварышоў, каб яны змаглі пасьля сваёй чысткі яшчэ больш замацаваць свой аўтарытэт сярод шырокіх колаў рабочае клясы і ў далейшым накіроўваць працу па перабудове краіны на сацыялістычны лад.

Л. Палеес.

1-ы ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД БЯЗБОЖНІКАЎ.

Адчыненьне зьезду.

6 чэрвеня ў клюбе імя Леніна адбылося ўрачыстае адчыненьне першага ўсебеларускага зьезду Саюзу Бязбожнікаў.

З усіх куткоў БССР на зьезд прыехала 50 дэлегатаў. Сярод іх бачыш сталага рабочага, работніцу, бязвусага юнака і сівога дзеда-селяніна. Убачыш рабочага і прафэсара вышэйшай навучальнай установы. Усе гараць адным імкненьнем: шырэй разгарнуць барацьбу на антырэлігійным фронце. Рабочы ад варштату, прафэсар БДУ і 70-гадавы селянін з Бабруйшчыны гараць адным жаданьнем—хутчэй зьнішчыць спадчыну праклятага царызму, гараць жаданьнем шырэй разгарнуць культурную рэвалюцыю.

Зьезд адчыняе старшыня часовага Цэнтральнага Савету Саюзу Бязбожнікаў тав. **Матулайціс**.

— Чым шырэй разгортваецца наша сацыялістычнае будаўніцтва, чым больш мы выцясьняем капіталістычныя элемэнты, тым больш рашуча апошнія вядуць наступ супроць новага быту, супроць новага жыцьця і нашага агульнага будаўніцтва.

Наш вораг яшчэ моцны. У нас яшчэ шмат хто гаворыць—„Без бога ни до порога". З такімі поглядамі ў сацыялістычным будаўніцтве далёка ня дойдзеш. Мы, бязбожнікі, закліканы змагацца са спадчынай царызму—рэлігіяй усіх масьцей. Мы павінны зьнішчыць гэты дурман.

Абраньне прэзыдыуму.

Пасьля ўступнага слова тав. Матулайціса зьезд абраў прэзыдыум, сэкратарыят, мандатную камісію і зацьвердзіў парадак дню.

У прэзыдыум абраны т. т. Стасевіч, Некрашэвіч, Карась, Якуб Колас, праф. Нікольскі, 70 гадовы бязбожнік—селянін з Бабруйшчыны і інш.

Пад гучныя воплескі ў ганаровы прэзыдыум абіраецца Палітбюро ЦК УсеКП(б), Бюро ЦК КП(б)Б і т. Яраслаўскі.

Пад воплескі ў прэзыдыум запрашаецца адзін з актывістых бязбожнікаў-рэктар БДУ праф. Пічэта.

Справаздача Цэнтр. Савету Саюзу Бязбожнікаў.

Пасьля афарміленьня прэзыдыуму і зацьверджаньня парадку дню зьезд заслухаў кароткую справаздачу Ц. Савету Саюзу Бязбожнікаў.

Да красавіка г. г. часовы Цэнтральны Савет на сваю працу ня меў ні капейкі грошай. Антырэлігійная праца ішла саматугам. На гэту працу мала зварачвалі ўвагі прафсаюзныя і іншыя арганізацыі. Калі надыходзіць якое-небудзь рэлігійнае сьвята, то мы пачынаем разгортваць антырэлігійную кампанію. Такім чынам, антырэлігійная праца ішла ў нас ад кампаніі да кампаніі.

Цэнтральны савет узяўся за афарміленьне і кіраўніцтва антырэлігійнай працай. Надышла антывялікодная кампанія, у часе якой бязбожнікі выявілі надзвычайную энэргію: ячэйкі таварыства расьлі з кожным днём; з 4000 членаў лік апошніх вырас да 50-60 тыс. чалавек.

Перад намі стаіць задача—шчыльна зьвязацца з акругамі; трэба наладзіць вучот сяброў і актывістаў таварыства. Новаму Цэнтр. Савету трэба мець свой цьвёрды бюджэт. Нам трэба ад саматужніцтва перайсьці да арганізаванай дружнай працы. Саюз Бязбожнікаў трэба зрабіць масавай арганізацыяй.

Працоўныя—супроць рэлігіі.

На вячэрнім пасяджэньні зьезд віталі прадстаўнікі шэрагу арганізацый, заводаў і школ.

Прадстаўнік ЦК КП(б)Б ставіць задачу перад зьездам—дабіцца таго, каб т-ва стала масавай арганізацыяй, каб таварыства яднала сотні тысяч актыўных барацьбітоў на антырэлігійным фронце.

Рабочы-чыгуначнік т. Панасюк заяўляе, што чыгуначны пралетарыят будзе актыўным барацьбітом з богам.

Тав. Кулік ад рабочых Асінстрою кажа, што вораг ня сьпіць, а таму бязбожнікі павінны шырэй разгортваць сваю карысную працу.

Работніца саюзу нархарчаваньня апавядае, што за год працы ячэйка, бязбожнікаў сярод цёмных няпісьменных хатніх работніц вырасла да 200 чал.

70-гадовы бязбожнік—селянін **Івашка** кажа: Усе старыя і малыя адчуваюць, што рэлігія—дурман. Нам трэба разам з камсамолам шырэй разгарнуць у вёсцы антырэлігійную працу.

— 300 гадоў чакалі мы царства зямнога і дачакаліся: дык няхай папы ідуць на неба, а нам і тут добра. Най, кажа сівы дзядуля, трэба дружней павесьці антырэлігійную працу. Не баяліся мы прагнаць цара і папоў, няма чаго баяцца прагнаць і прапаведнікаў —„царства божага".

Нам патрэбна культура, патрэбен сьвет, нам патрэбна калектывізацыя.

«Няхай машыны на палёх свой водзяць харавод»,—дэклямуе свой верш селянін Івашка.

Віталі зьезд ад бязбожнікаў VI польской школы, ад IX школы, рабочы Эльводу, ад вячэрняга рабфаку.

Рабфакавец ад 260 членаў ячэйкі бязбожнікаў рабфаку запэўніе зьезд, што студэнты рабфаку ў часе летніх вакацый на мясцох будут праводзіць у жыцьцё ўсе пастановы зьезду бязбожнікаў.

Зьезд ухваліў адозву да ўсіх бязбожнікаў і ўсіх працоўных БССР аб барацьбе з рэлігійным дурманам.

Да ўсіх членаў Саюзу Бязбожнікаў і ўсіх працоўных Савецкай Беларусі.

Таварышы! Са ўсіх куткоў нашае Савецкае Беларусі сабраліся ў Менск бязбожнікі на свой першы зьезд дзеля вырашэньня вельмі важных і цяжкіх задач барацьбы за новага чалавека, за новае разумнае культурнае жыцьцё працоўных.

У той час, калі пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі ў нашай савецкай краіне ўсё больш шырока разгортваецца гаспадарчае і культурнае будаўніцтва ў горадзе і ў вёсцы, калі на нашых вачох шматмільённыя колы рабочае клясы і працоўнага сялянства ўсё больш актыўна выступаюць дзеля перабудаваньня свайго жыцьця на новым сацыялістычным грунце, у той час, калі патрэбна моцная братэрская згуртаванасьць працоўных усіх народаў і іх максымальная напружанасьць у барацьбе за індустрыялізацыю нашае краіны, за калектывізацыю сельскае гаспадаркі, за падняцьце ўраджайнасьці бядняцкіх і серадняцкіх палёў—у гэты самы час мы на цяжкім шляху нашае будаўнічае працы сустракаем старых злых ворагаў, якія актыўна перашкаджаюць усім новым мерапрыёмствам партыі і савецкай улады. Нэпман, кулак, гандляр, спэкулянт—усе гэтыя хаўрусьніні, адчуваючы, што ўсё бліжэй і бліжэй надыходзіць іх пагібель, усё больш актыўна супраціўляюцца, дамагаюцца затрымаць астатні старога сьвету. У сваёй барацьбе супроць дыктатуры пралетарыяту, супроць сацыялістычнага будаўніцтва яны маюць верных і адданых памоцнікаў: папоў, ксяндзоў, рабінаў, сэктантаў і іншых „сьвятых братоў", якія праз цэрквы, касьцёлы, сынагогі намагаюцца адцягваць увагу працоўнага люду ад сваіх кроўных жыцьцёвых інтарэсаў. Яны намагаюцца накіроўваць увагу працоўных мас да неба, да бога, пужаюць працоўныя масы „страшным судом на тым сьвеце", каб пасьлабіць іх энэргію ў барацьбе за свае зямныя запатрабаваньні. „Святые отцы" секуць нацыянальную нянавісьць паміж працоўнымі масамі розных нацыянальнасьцяў каб парваць іх братэрскі саюз.

Таварышы! Першы зьезд Саюзу Бязбожнікаў БССР ад імя пяцідзесяцітысячнай армії бязбожнікаў, паўстаўшых супроць багоў і царцей, супроць папоў, ксяндзоў, рабінаў, супроць уэёй „сьвятой брацыі" заклікае вас на дапамогу. На барацьбу супроць рэлігіі, супроць папоўска-рабінскага ашуканства працоўных мас паўстанем разам пад сьцягам Саюзу Бязбожнікаў. Рашуча адкінем ад сябе пустую веру ў бога, прагонім манахаў, папоў, ксяндзоў, рабінаў, сэктантаў—усіх гэтых агентаў буржуазеі, абернем цэрквы, касьцёлы, сынагогі ў рабочыя і сялянскія клюбы і з цьвёрдай верай толькі ў свае ўласныя сілы пабудуем новае свабоднае, культурнае жыцьцё.

„Рай і пекла на тым сьвеце" — папам, рабінам і ўсім „сьвятым".

Лепшае жыцьцё на гэтым сьвеце—рабочым, сялянам і ўсім працоўным.

Няхай жыве культурнае бязбожнае жыцьцё працоўных мас!

Няхай жыве Саюз Бязбожнікаў — верны змагар за новага чалавека.

Няхай жыве камуністычная партыя, яна правільным шляхам вядзе ўсё працоўнае грамадзтва да перамогі над старым сьветам!

І УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД БЕЗБОЖНІКАЎ.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Клясавы вораг за сьпіною Калінкавіцкага РВК.

Гаспадарка жыхара вёскі Гарочыцы Дроніка Янкі да рэвалюцыі мела 94 дзесяціны добраякаснай зямлі, а зараз мае ў сваім карыстаньні 70 дзесяцін. Дронік Янка па фальшывай даведцы, што ён батрак, паступае на Рагачэўскія пэдагагічныя курсы, дзе атрымоўвае адукацыю настаўніка. Увосень 1928 году Дронік прызначаецца Калінкавіцкім РВК настаўнікам у Хаміцкую школу. Дронік кажа, што савецкая ўлада сялянам нічога не дала.

Дронік Янка як кулак-эксплёататар пазбаўлены выбарчых правоў. Аб Дроніку пішуць у газэце, аб Дроніку гавораць на сходах, але гэта нічога ня значыць для Калінкавіцкага РВК і райінспэктуры Нарасьветы. Пасьля двух допісаў зьмешчаных у „Савецкай Беларусі" адносна Дроніка, як клясавага ворага, Калінкавіцкі РВК аднаўляе яго ў правох голасу і залічаецца ён сябрам саюзу.

Аб Дроніку ўсё такі гавораць, асабліва гаворыць бедната вёскі Гарочыцы, а таму каб паказаць, што Дронік на цьвёрдым падмурку, РВК пасылае Дроніка Янку на 2-хмесячныя настаўніцкія курсы ў гор. Мазыр. Праўда, трэба каб у Гарочыцах былі адукаваныя «былыя людзі», бо бедната вёскі Гарочыцы арганізавалася, будуе калгасы і будуе моцна, так што неадукованы кулак ня зможа раскідаць. Другога тлумачэньня знайсьці нельга.

Мы гаварылі, мы пісалі аб гэтым факце, але нічога не памагае, а цяпер парашылі зьвярнуцца да „Савецкай Беларусі", можа яна дапаможа нам у барацьбе з цьвёрдалобымі з Калінкавіцкага РВК і яго інспэктуры Нарасьветы. **Група сялян Беднякоў.**

Ёсьць дасягненьні.

(Мазыр).

У выніку праведзенай працы з беднатой і растлумачальнай працы наогул сярод насельніцтва па павышэньні ўраджайнасьці і аб новым законе па сельска-гаспадарчым падатку ў Галоўчыцах і аколіцы, Нараўлянскага раёну ёсьць дасягненьні.

Ачыстка насеньня ў час пасеўнай кампаніі праведзена ў 11 насельных пунктах сельсавету. Усяго ачышчана насеньня 4138 п. 20 ф., процант выпаўненьня заданьня 95. Попелу сабрана па с.-с. 912 пуд. Арганізавана адно малочнае таварыства і знаходзяцца ў стадыі арганізацыі 2 калгасы.

Пры правядзеньні растлумачальнай працы сялянства цікавілася падняцьцем ураджайнасьці і асабліва новым законам па сельска-гаспадарчаму падатку, за выключэньнем заможнай часткі, якая выступала на агульных сходах з агітацыяй супроць падняцьця ўраджайнасьці. „Ня трэба падніміць ураджайнасьць, бо будуць вялікія падаткі, трэба ўсім рабіцца беднякамі"—так выказваліся яны на сходах, але-ж падтрымкі з боку беднаты яны ня мелі.

Як недахоп, усё-ж трэба адзначыць, што вялікая частка сялянства гэтага сельсавету да ачысткі насеньня ня была прыцягнута.

М. Г.

Зрабілі пісьменнымі 1860 асоб.

Полацан, 5-6. Пры непасрэднай дапамозе з боку грамадзка-асьветных арганізацый па Полацкім раёне з посьпехам праходзіла праца па зьнішчэньню няпісьменнасьці сярод сялянства, асабліва сярод жанчын.

Усяго па раёну налічвалася каля 100 ліквпунктаў і школ для малапісьменных, якія навучылі пісьменнасьці 1860 чал., галоўным чынам сялянак і дзяўчат.

Сярод вучняў праводзілася шырокая грамадзкая праца: гутаркі, даклады, лекцыі аб карысьці ліквідацыі няпісьменнасьці, культурнай рэвалюцыі, аб уздыме сельскай гаспадаркі, аб падняцьці ўраджайнасьці, на мэдыцынска-санітарныя тэмы, чытка, распрацоўка газэт, часопісяў і кніжак.

Трыццаць процантаў скончыўшых ліквпункты выпісваюць розныя газэты і актыўна працуюць у ячэйках „Прэч Няпісьменнасьць". Сярод выпускнікоў замацоўваецца сыстэматычная праца і ў летні час.

Пачалася асушка балот і Асьвейскага возера.

Полацан, 7-6. Некалькі дзён таму назад пачалася работы па асушцы балот і спуску часткі Асьвейскага возера, якое па велічыні адно з большых вазёр у Савецкай Беларусі. Работы праводзяцца каля вёскі Ігналіна, Красоўскага сельсавету. На ўрачыстае адчыненьне гэтых вялікіх работ сабралася шмат сялянства з вокалічных вёсак, прыехалі райённыя працаўнікі і загадчык Полацкага АКРЗА. Пры вялікім зборы насельніцтва было праведзена ўрачыстае адчыненьне работ—сьвята ўсяго працоўнага насельніцтва Асьвейшчыны.

Асушка балот і спуск часткі возера дадуць сялянству 8 тысяч гэктараў добрай пахатнай зямлі. На праваздзімых работах будзе занята каля 300 чалавек.

Міхед.

Будуем калгасы.

Бабруйск, 7-6. Акруговы калгассаюз прыступіў да арганізацыі 2 новых яўрэйскіх калгасаў у Рагачэўскім і Сьвіслацкім раёнах.

У апошні час у Жлобінскім раёне арганізаваўся шляхам аб'яднаньня трох дробных калгасаў адзін буйны яўрэйскі калгас. Калгас мае ў карыстаньні цяпер 600 гэктараў зямлі. У хуткім часе распачынаецца праца па арганізацыі яшчэ 2-х яўрэйскіх калгасаў на акрузе.

Лік новых укладчыкаў расьце.

Полацан, 6-6. З кожным днём пашыраюць сваю дзейнасьць касы ашчаднасьці, як у горадзе, так і ў вёсцы. Месячнік ашчаднасьці, даўшы ўзрост укладчыкаў у касы на 6857 чалавек з сумай укладаў у 73974 руб., паказаў, што працоўныя заўсёды гатовы сваімі рэсурсамі крэдытаваць дзяржаву, гэтым самым дапамагаць сацыялістычнаму будаўніцтву.

За лепшую пастаноўку працы па ўцягненьню новых укладчыкаў акруговая камісія садзейнічаньня ашчадсправе выдала прэміі: Вульскай, Барковіцкай, Бігосаўскай ашчадкасам і лістаносцам: Булу, Ладзіну, Глазкіну і Сухарукаву, а таксама выдадзены прэміі селькорам, якія добра асьвятлялі ход „двухтыднёвіка ашчаднасьці".

На торфараспрацоўках.

Бабруйск, 7-6. За лета бягучага году на торфараспрацоўках Бабруйшчыны мяркуецца здабыць 30960 тон торфу. Гэтая колькасьць торфу будзе скарыстана на апал. Апрача таго вядзецца здабыча торфу на ўгнаеньне. На гэтую мэту будзе здабыта 17 тыс. тон торфу.

М. КАРКЛІН.

Больш актыўнасьці ў хімізацыі народнай гаспадаркі

Наш пяцігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры зацьверджан IX Усебеларускім Зьездам Саветаў. Гэты плян на сваіх мэтавых устаноўках—на ўзмацненьне індустрыялізацыі краіны, на сацыялістычную перабудову ўсёй народнай гаспадаркі і асабліва сельскай гаспадаркі—патрабуе вялікага тэмпу росту і навукова-тэхнічных дасягненьняў. Наш пяцігадовы плян яскрава гаворыць, што ён ня толькі зьяўляецца плянам адкрытага сацыялістычнага наступленьня на прыватна-капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, але і вымагае, каб ажыцьцяўляўся ў бліжэйшым гістарычным пэрыядзе лёзунг і магчыма-сьць дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны ў іх вытворчым разьвіцьці. Іншымі словамі, ідзе барацьба спаборніцтва двух сьветаў—капіталістычнага і сацыялістычнага.

Савецкі Саюз—першая ў сьвеце пралетарская дзяржава, якая зьяўляецца застрэльшчыкам у гэтай барацьбе,—павінен выйсьці і выйдзе пераможцам. Гарантыяй гэтага павінна быць тая грандыёзная калектыўная праца, якая ўжо разгорнута ўсімі працоўнымі Савецкага Саюзу і нашай Беларусьсю, прычым гэтая праца павінна быць накіравана пры поўным скарыстаньні дасягненьняў навукі і тэхнікі.

Нашы ліміты за пяцігодзьдзе немалыя. Яны абвяргаюць сваімі разьлікамі ўсім вядомую практыку разьвіцьця капіталістычных краін у самым росквіце іх росту. Напрыклад, па Беларусі мы патрабуем: росту прамысловай прадукцыі ў сярэднім у год за пяцігодзьдзе ад 30-35 проц.; узьняцьця ўраджайнасьці палёў—на 45 проц.; энэргіфікаваць нашую прамысловасьць замест цяперашніх 33 проц. да 88 пр.; знайсьці самы моцны тэмп магчымасьці скарыстаньня мясцовага апалу—торфу і пусьціць яго ў электрычную энэргію; замест цяперашніх 50 тысяч тон мінэральных угнаеньняў, што ўкладаюцца ў глебу, давесьці ў канцы пяцігодзьдзя гэты разьмер укладаньняў да 900 тысяч тон; узьняць вытворчасьць працы ў прамысловасьці на 100 проц.; панізіць сабекошт прадукцыі на 32 проц., і г. д. і іншыя ліміты, якія прымушаюць усіх нас сур'ёзна, не пакладаючы рук, папрацаваць і знайсьці ўсе шляхі да палегчаньня выкананьня пяцігадовага пляну.

... «Разьвіцьцё народнай гаспадаркі БССР патрабуе максымальнага скарыстаньня ўсіх дасягненьняў навукі і тэхнікі»...—так фармуляваў XII Зьезд КП(б)Б гэтую задачу пры разглядзе дырэктыў па складаньні пяцігадовага пэрспэктыўнага пляну.

Далей зьезд у сваёй пастанове гаворыць:

... «Адным з найбольш важных мерапрыёмстваў у справе атрыманьня найбольш эканамічнага эфэкту зьяўляецца задача найбольшага скарыстаньня хімічных дасягненьняў у народнай гаспадарцы.'

Таму справе хімізацыі народна-гаспадарчых працэсаў трэба аддаць самую сур'ёзную ўвагу, і разьвіцьцю галін хімічнай прамысловасьці. Трэба паставіць на першым месцы, асабліва тых галін хімічнай прамысловасьці, якія павінны садзейнічаць індустрыялізацыі і хутчэйшаму ўздыму сельскай гаспадаркі"...

Значыць, гэтая дырэктыва камуністычнай партыі і савецкай улады надзвычайна яскрава паказвае шлях, які палягчае прысьпяшыць тэрміны дзеля дасягненьня канчатковай мэты сацыялістычнага будаўніцтва.

Але трэба сказаць, што ня ўсе яшчэ да гэтага часу зразумелі значэньне хіміі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Тэхнічны пераварот у галіне хіміі ў сэнсе значэньня яе для ўсёй народнай гаспадаркі выходзіць далёка за межы адной толькі хімічнай прамысловасьці. Трэба зараз ужо надаць больш увагі пытаньню разьвіцьця хімізацыі ўсіх галін народнай гаспадаркі. Разьвіцьцё і ўсебаковае садзейнічаньне ў справе разгортваньня навуковых тэхнічных інстытутаў адыграе р

Больш увагі пытаньням нацпалітыкі.

Дырэктывы партыі аб беларусізацыі выконваюцца слаба. Беларуская мова яшчэ ня ўсюды ўвайшла ў быт і жыцьцё ўстаноў. Трэба са ўсёю рашучасьцю прыступіць да ўзмацненьня тэмпу беларусізацыі.

НЕАБХОДНА ЎЗМАЦНІЦЬ ТЭМП БЕЛАРУСІЗАЦЫІ.

(ФАКУЛЬТЭТ ПРАВА І ГАСПАДАРКІ БДУ).

У справаздачным дакладзе ЦК на XII зьезьдзе КП(б)Б тав. **Гамарнік** у разьдзеле аб нацпалітыцы з усёй рашучасьцю паставіў пытаньне аб тым, што

„трэба ўсімі мерамі ўзмацніць прысьпешаны тэмп беларусізацыі, далейшае разьвіцьцё беларускай культуры, як аднаго з магутных сродкаў узмацненьня сувязі гораду з вёскай, пры ўсё ўзрастаючым кіраўніцтве вёскаю з боку рабочае клясы, як аднаго са сродкаў узмацненьня пралетарскай дыктатуры ў Беларусі і „кіруючай ролі камуністычнай партыі“.

Адзначаная роля тэмпу беларусізацыі абавязвае кожнага сумленнага працаўніка на загонах сацыялістычнага будаўніцтва неадкладна прыступіць да практычнага разьвязваньня пытаньня аб беларусізацыі, памятаючы, што беларусізацыя ёсьць частка агульнага пытаньня аб нацпалітыцы, а нацпалітыка—

„Ёсьць частка агульнага пытаньня аб пралетарскай рэвалюцыі, частка пытаньня аб дыктатуры пралетарыяту“.

(тав. СТАЛІН).

Калі мы цяпер возьмем факультэт Права і Гаспадаркі БДУ і паглядзімо, як далёка студэнцтва апошняга прасунулася ў пытаньні асваеньня беларускай мовы, то павінны будзем, выходзячы з рэчаіснасьці, канстатаваць нязначны зрух у гэтай галіне. Камісія, якая была вызначана бюро ячэйкай КП(б)Б па праверцы выкананьня партыйцамі і камсамольцамі пастаноў партыі ў пытаньні беларусізацыі, адзначыла наступнае:

„Галоўным недахопам у справе праламленьня дырэктыў партыі ў галіне беларусізацыі зьяўляецца тое, што з 96 праверэных таварышоў толькі 48 асоб здавальняюча асвоілі беларускую мову ды і то пераважная частка з іх зусім фармальна падыходзіць да нарыстаньня мовай, за выключэньнем чалавек 12—15, якія ўмываюць белмову як у быту, так і на сходах“.

І далей у выніках камісіі гаворыцца:

„Другая-ж частка партыйцаў, ня гледзячы на тое, што яны чытаюць, пішуць і ўмеюць гаварыць па беларуску, зусім ня імкнецца да ўмываньня беларускае мовы ў быту і на сходах, тлумачачы гэта нейнімі „спэцыфічнымі“ і „аб'ектыўнымі“ умовамі“.

Аналёгічнае становішча ў гэтым пытаньні мы маем і сярод камсамольцаў факультэту, за выключэньнем тых, якія паступалі ў гэтым 28-29 навучальным годзе: яны больш дасканала ўсвоілі беларускую мову і карыстаюцца ёю ў быту хоць далёка і ня ўсе.

Так абставіць пытаньне з беларусізацыяй у партыйнай і камсамольскай арганізацыях факультэту. Трэба са ўсёй рашучасьцю адзначыць, што дырэктывы і ўказаньні вышэйшых органаў і пастановы ячэек у пытаньні беларусізацыі далёка ня выконваюцца так, як гэта вымагае рэчаіснасьць. Праца ў гэтым напрамку вядзецца невыстарчальна.

Каб поўна ахарактарызаваць становішча беларусізацыі факультэту, нельга абмежавацца толькі рамкамі партыйнай і камсамальскай арганізацыі, а паказаць і на тое, на якой ступені ўсваеньня беларускай мовы знаходзіцца ўсё студэнцтва факультэту, а таксама і яго навуковыя працаўнікі.

Беларускую мову ўсвоілі да 50 проц. студэнтаў, але толькі нязначная частка іх стала штодзённа карыстацца ёю; другая-ж частка мову захоўвае ў таямніцах свайго асабістага „я“, накшталт хусткі да носу, і дастае яе толькі ў выпадках, калі гэтага «настойліва патрабуе маса»—на сходах, насяджэньнях і інш.

Астатнія 50 проц. студэнцтва, а мо'крыху і больш стаіць, гаворачы фігуральна, з шык-палачкай у руцэ, „перавараччвае“ апошняй з боку на бок і «увесь» лексыкон белмовы, «грае» з ёю, як прамень сонейка ў вадзе, але заняцца сумленным вывучэньнем беларускае мовы, яе асаблівасьцяй, яе законаў—ад гэтага яны далёка.—Такое становішча гаворыць толькі аб адным, што гэта катэгорыя студэнцтва далёка не ўявіла важнасьці дапага пытаньня, а таксама і тых пастаноў, якія існуюць адносна беларусізацыі, г. зн. не разуме ўсёй важнасьці таго курсу, які партыя і савецкая ўлада праводзяць у пытаньні нацпалітыкі.

Аб навуковых працаўніках.

Існуе не адна пастанова праўленьня БДУ аб хутчэйшым пераходзе навуковых працаўнікоў на беларускую мову, нават зафіксаваны пэўныя тэрміны, на працягу якіх той ці іншы навуковы працаўнік павінен выканаць гэтую пастанову. Але... але, ня гледзячы на гэта, сярод прафэсуры і дацэнтуры існуе якаясьці «баязьлівасьць» у пераводзе выкладаньня сваёй дысцыпліны на беларускую мову, і справа гэта рухаецца зусім павольным тэмпам. Некаторыя студэнты гэту «баязьлівасьць» навуковых працаўнікоў у пытаньні беларусізацыі схільны тлумачыць тым, што нібыта прафэсура і дацэнтура ня хоча чытаць лекцыі на беларускай мове, каб ня страціць вонкавай прыгожасьці (?) сваіх лекцый. Выходзіць так, што беларуская мова не дарасла яшчэ да таго, каб з „вышыні“ універсытэцкай катэдры на ёй можна было чытаць тую ці іншую дысцыпліну.

Я, між іншым, далёка ад тэй думкі, што нашы навуковыя працаўнікі ў асноўнай масе сваёй стаяць на пазіцыі такіх поглядаў у дачыненьні да беларускай мовы. Прычыны слабога тэмпу беларускай мовы сярод навуковых працаўнікоў, на мой погляд, хаваюцца ў чымсьці іншым.

Праўда, ёсьць у нас і такія навуковыя працаўнікі, якія жывуць у Беларусі даволі значны час, які зусім дастатковы для ўсваеньня беларускай мовы, але... Нават больш таго, можна пабачыць і такіх працаўнікоў, якія ўладаюць мовай, выступаюць з дакладамі на сходах і зьездах на беларускай мове, але вось чамусьці студэнцтву ў мурох Беларускага Унівэрсытэту лічаць сваім абавязкам чытаць лекцыі толькі на расейскай мове.

Як відаць, і тут мы маем буйныя недахопы ў тэмпе ажыцьцяўленьня пастаноў адносна правядзеньня беларусізацыі.

У выніку мы маем тое, што факультэт Права і Гаспадаркі да гэтага часу беларусізаваны зусім кепска: толькі 32,8 проц. вучэбных гадзін пераведзена і так-сяк выкладаецца на беларускай мове.

Мне здаецца, што такі „тэмп“ ходу беларусізацыі ф-ту будзе працягвацца да таго часу, пакуль мы і па лініі партыйнай, і камсамольскай, і ўсіх іншых студэнцкіх арганізацый, а таксама і навуковых сіл ня зробім карэннага пералому ў справе пераходу ад разважаньня і прапаноў да практычнае працы па ўсваеньні беларускай мовы.

У правядзеньні беларусізацыі нашага факультэту, на мой погляд, трэба рэалізаваць наступныя мерапрыёмствы:

У 1929-30 навучальным годзе дабіцца пераводу на беларускую мову ня меней 65-70 проц. усіх вучэбных гадзін.

Праца ўсіх існуючых сэмінараў павінна праходзіць на беларускай мове.

Палепшыць якасьць мовы насьценнай газэты ф-ту, зьліквідаваўшы ўжываньне ў асобных выпадках небеларускіх выразаў, русіцызмаў і граматычных памылак.

Працу па беларускай мове неабходна паставіць так, каб зацікавіць ня толькі тых студэнтаў, якія зусім ня ведаюць беларускай мовы, але і тых, якія ведаюць яе недастаткова.

Студэнты, якія ведаюць беларускую мову, павінны больш рашуча ўносіць яе ў быт, дапамагаючы гэтым самым хутчэйшаму ўсваеньню беларускай мовы студэнцтву, якое слаба яе ведае.

М. Асака.

Аб машыністцы, беларусізацыі і „капрызах“ адказных...

Умовы працы машыністак у Менску, як цэнтры Беларусі, вельмі цяжкія. Машыністка ня толькі павінна ўмець друкаваць на беларускай мове, але яна **павінна і абавязана** ўмець перакладаць усе даклады, лісты на беларускую мову, бо нашы кансультанты, рэфэрэнты, юрысконсульты да гэтага часу дрэнна ведаюць мову і ўвесь цяжар іх «творчества» яны ўскладаюць на машыністку.

— Я не абавязан пісаць свае даклады на беларускай мове, няхай машыністка аб гэтым клапоціцца—кажуць некаторыя, якія да гэтага часу ня вывучылі беларускай мовы.

На гэтай глебе машыністкам даводзіцца мець вялікія няпрыемнасьці і непаразуменьні.

Ёсьць і такія выпадкі, калі той ці іншы спэцыяліст прымушае машыністку выпраўляць памылкі ў расейскім тэксьце, а пасьля гатага перакласьці яго ліст на беларускую мову.

Пры абсьледаваньні нацкамісіяй ведаў беларускай мовы ў цэлым шэрагу ўстаноў выявілася, што ведаюць мову амаль выключна машыністкі, і, вядома, што іншыя працаўнікі кідаюць ім (і нават часта нядбайна) розныя паперы „искрованные“, „истерзанные“ рознымі выпраўленьнямі, дадаўшы пры гэтым; «абавязкова надрукуйце [па-беларуску»...

Саюз савгандальслужачых два гады таму назад меў на думцы добрую справу; арганізаваць бюро машыністак пры ЦП, якое магло-б рэгуляваць розныя заблытаныя пытаньні, рацыяналізаваць працу, палегчыць некаторыя асаблівыя цяжкасьці, але... гэта толькі засталося на паперы і становішча машыністак ва ўстановах робіцца з кожным днём горшым, бо, акрамя акуратнасьці, шпаркасьці і чыстаты, якія патрабуюцца, трэба быць „перакладчыцай“.

Адзін з адказных працаўнікоў Дзяржгандлю — юрысконсульт зьявіўся да машыністкі тав. Ш. насьля заняткаў з гэткай прамовай: «Заўтра з 9 гадзіны раніцы да 3/4 дзесятага ў нас пасяджэньне ў дырэктара, у якім мы выпраўляем надрукаваны вамі статут, ад 3/4 дзесятага да паловы адзінаццатага вы **павінны** перадрукаваць выпраўлены статут, бо ў сорак хвілін адзінаццатага статут павінен быць... у ЭКАНА».

— Дазвольце,—абурылася тав. Ш., —але-ж гэта немагчыма, я-ж ня маю магчымасьці за 45 хвілін надрукаваць вам 12 старонак і пры ўсім сваім жаданьні выканаць ваш загад не магу.

— Ну, я нічога ня ведаю, гэта павінна быць выканана... І да таго, вядома, статут павінен быць надрукаваны на... беларускай мове.

Гэткія выпадкі не адзіныя; адну машыністку ў Белкаапсаюзе акружаюць 5-6 кансультантаў, аднаму—парасейку, другому—па-беларуску, трэцяму—перапісаць, а чацьвертаму—выправіць.

Чарнавікі даюцца ў самым дрэнным выглядзе, і машыністцы трэба траціць шмат часу, каб зразумець словы і думкі.

Эканомкамісіі ня прымаюць мер да ўрэгуляваньня пытаньняў з беларусізацыяй, не зварачваюць увагу на „капрызы“ адказных працаўнікоў, а машыністкі зьяўляюцца «козлом отпущения» за ўсе грахі...

Манін.

ПЛЕНУМ ЦС СЭКЦЫІ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ.

Выступленьне т. Затонскага.

На пленуме цэнтральнага савету сэкцыі навуковых працаўнікоў БССР 5-га чэрвеня выступіў з інфармацыяй аб ажыцьцяўленьні нацыянальнага пытаньня ў БССР— т. Затонскі.

Нацыянальнае пытаньне,—кажа т. Затонскі,—зьяўляецца адным з важнейшых і разам з тым цяжкіх пытаньняў. У прыватнасьці, калі ўзяць БССР, дык тут да рэвалюцыі існаваньне беларускай культуры проста адмаўлялася. Царскі ўрад імкнуўся выкараніць усё беларускае. Пасьля кастрычніка прышлося ўтвартць усё спачатку. Трэба было хуткім тэмпам уздымаць культурны ўзровень мас. Дзеля гэтага было неабходна іменна разьвіваць нацыянальную беларускую культуру. У некаторых адносінах БССР па разгортваньні нацыянальнай культуры напамінае Украіну. Як там, так і тут ёсьць людзі, якія не разумеюць, а таксама і не жадаюць зразумець нацыянальнай палітыкі партыі. І тут і там сярод навуковых працаўнікоў можна спаткацца з праявай мясцовага шавінізму, з фактамі расейскага вялікадзяржаўніцтва, з арыентацыяй на буржуазны захад і г. д.

Побач з правядзеньнем беларусізацыі ня менш важнай задачай зьяўляецца разьвіцьцё культур нацменшасьцяй, якія насяляюць БССР.

Камісія ЦКК УсеКП(б) зварочвае асаблівую ўвагу на выраішэньне ў нашай практыцы польскага, яўрэйскага пытаньняў. На практыцы нацыянальнай работы сярод польскага насельніцтва мы павінны паказаць капіталістычнаму захаду ўсю перавагу савецкай сыстэмы.

Гаворачы далей аб беларускай культуры, т. Затонскі кажа, што ў беларускай культуры, як і ва ўсякай іншай, можна знайсьці элемэнты адхіляючага фэадалізму, у прыватнасьці, у форме клерыкалізму, і адбіткі мараў дробнай буржуазеі. Ёсьць і элемэнты рэвалюцыйныя. Вось гатыя апошнія трэба ўзмацняць, і на гэтай падставе трэба разгортваць нацыянальную культуру.

Прамова т. Затонскага выклікала жывы абмен думкамі. Выступалі т. т. Парэчын, Сэрбэнта, Вальфсон, Камінскі і інш., якія адзначалі, што трэба даць рашучы адпор як мясцоваму, так і вялікадзяржаўнаму шавінізму. Трэба зьнішчыць тэрытарыяльную адчужаванасьць і абменьвацца практыкай нацыянальнай работы з іншымі рэспублікамі.

Беларусізацыя навучальных устаноў.

Водлуг вестак Наркамасьветы, усе школы сацыяльнага выхаваньня, за выключэньнем школ нацменшасьцяў, школ Гомельшчыны і чыгуначных, цалкам працуюць на беларускай мове. У школах-жа Гомельшчыны і чыгуначных выкладаньне на беларускай мове пакуль што вядзецца толькі ў 1—5 групах.

Горш стаіць справа з беларусізацыяй у прафтэхнічных школах. Праўда, у сельска-гаспадарчых школах агульнаадукацыйныя і грамадазнаўчыя дысцыпліны выкладаюцца поўнасьцю на беларускай мове, спэцыяльныя-ж прадметы на беларускай мове выкладаюцца толькі на 50—60 проц.

ПАДАГУЛЬВАЕМ ВЫНІКІ ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ.

Праз творчую ініцыятыву і актыўнасьць мас, праз агрыкультурныя палепшаньні—узьнімем ураджай нашых палёў.

Змагары за лепшы ўраджай.

(Ліст з Бабруйшчыны).

Іх шмат на Бабруйшчыне... Калгасы, савгасы, вёскі, пасёлкі і асобныя гаспадаркі, якія заявілі аб сваім выступленьні за лепшую арганізацыю працы, за лепшы ўраджай. Мы маем права назваць змагарамі за выкананьне заданьняў ураду па барацьбе за палепшэньне вытворчасьці сельскае гаспадаркі.

Дзесяткі вёсак, пасёлкаў, калгасаў уступаюць у сацыялістычнае спаборніцтва, але сягоньня гутарка будзе ісьці пра тых, хто ўжо на справе выконвае пастаўленыя задачы па ўздыму ўраджайнасьці. І такіх на Бабруйшчыне шмат. Вось факты.

Сяляне Юкшынкага сельсавету, Слуцкага райёну правялі ў гэтым годзе пасеў радковаю сеялкаю.

— Далоў сявалку,—заявіла беднота. Мы прапануем нашаму камітэту сялянскай узаемадапамогі здабыць на сродкі камітэту радковую сеялку,—такую катэгарычную прапанову дала беднота. І камітэт яе выканаў. Цяпер сяляне з гонарам заяўляюць, што, правёўшы пасеў сеялкаю, яны з'эканомілі шмат насеньня і спадзяюцца атрымаць лепшы ўраджай.

Факт другі—"Далоў трохпалёўку,—заявіла сялянства пасёлкаў Парасьні, Старадароскага райёну і Закуцьце, Клічаўскага райёну. Даволі нам сьпіну гнуць на дзедаўскім землякарыстаньні. Даёш канюшыну, карняплоды.

Гэта сялянствам выканана. Цяпер пасёлкі перайшлі на васьмімольле і з будучага году пачынаюць ужо правільнае вядзеньне гаспадаркі па новым севазвароце.

Многія пасёлкі ўзяліся за скарыстаньне цаліны, якая да гэтага часу не давала ніякай карысьці. Так, калгас Ботвіна ў Слуцкім райёне падымае ў гэтым годзе 55 гэктараў цаліны. У тым-жа райёне пасёлак Цераспoль таксама падымае цаліну на плошчы ў 15 гэктараў і 20 гэктараў балотнай плошчы ў гэтым годзе мяркуе прывесьці ў годнасьць для пасеву. Такія факты скарыстаньня цаліны мы наглядаем у многіх пасёлках Бабруйшчыны.

Вялікую працу па практычнаму ўдзелу ў барацьбе за лепшы ўраджай правялі пасёлкі Глускага райёну Пабеда і імя Дзяржынскага. Да гэтага часу ў іх ужо арганізавана насеннае таварыства, праточана і ачышчана насеньне да пасеву, праведзена шматпольле, засеяна 23 гэктары канюшыны, пад азімае жыта падсеяна сэрадэля.

Гэтыя пасёлкі заклалі ў гэтым годзе штучныя вывасы. Гэта мера новая і яна паслужыць практычным прыкладам акольным пасёлкам. Арганізавалі гэтыя пасёлкі ў сябе бычына-сьвіноводнае таварыства, заклалі некалькі ўзорных вучасткаў і г. д.

Гэтыя факты як нельга лепей характарызуюць імкненьне сялянства дабіцца як мага хутчэй лепшых ураджаяў, падняць вытворчасьць сельскай гаспадаркі.

Кожны з прыведзеных фактаў (а іх прыведзена маленькая доля з маючыхся на акрузе) зараджае другія вёскі, пасёлкі і асобных гаспадароў імкненьнем барацьбы за лепшы ўраджай. З кожным днём гэтая барацьба разгортваецца шырэй і шырэй.

А. Дамброўскі.

За падвышэньне ўраджайнасьці.

Саюз савецкіх і гандлёвых служачых Аршаншчыны праводзіць вялікую працу як у падшэфных вёсках, так і ў цалым шэрагу іншых вёсак за падвышэньне ўраджайнасьці. Пасьля таго, як была праведзена вялікая падрыхтоўчая праца, саюз узяўся за больш практычную працу. Перш за ўсё былі створаны грашовыя фонды для працы на вёсцы як у Воршы, так і пры райгрупкомах г. г. Копыся, Горак, Дуброўны і ў Лядах. Сродкі для гэтых фондаў здабываліся ад правадзімых саюзам суботнікаў і нядзельнікаў, а таксама і з адлічэньняў членаў саюзу.

Асабліва трэба адзначыць нядзельнік, які быў праведзен у горадзе адміністрацыйна-савецкай і паўвайсковай групай саюзу. Гэты нядзельнік прайшоў з вялікім уздымам і вялікай арганізаванасьцю. За гэты дзень члены саюзу шмат выгрузілі і пагрузілі хлебапрадуктаў на чыгунцы і гэта дало каля 800 руб. сродкаў.

Усяго за час правядзеньня кампаніі суботнікаў і нядзельнікаў саюз сабраў звыш тысячы рублёў на стварэньне фонду па працы у вёсцы ў галіне палепшаньня і падвышэньня ўраджайнасьці.

За гэтыя сродкі саюз закупіў і даў падшэфным сельсаветам дзеля карыстаньня беднаты сельска-гаспадарчы інвэнтар і насеньне, выключна для беднаты. У чатырох падшэфных сельсаветах саюз арганізаваў пракатныя машынныя пункты, для якіх закуплена: 11 пружынных барон дзевяцізубовых, 11 палутарных сухеневскіх плугоў, 9 акучнікаў, 4 качкарэзы, 1 сяміградная сеялка і 1 зернаачысьцільная машына „трыумф“. Гэтыя пракатныя пункты павінны стаць базай для арганізацыі машынных таварыстваў у вёсках падшэфных сельсаветаў.

Апрача гэтага, Дубровенскі райгрупком купіў для падшэфнай вёскі трыер і Копыскі райгрупком 45 пудоў насеньня для бядняцкіх гаспадарак.

У вёску выяжджалі брыгады, арганізаваныя саюзам. Гэтыя брыгады звыш таго, што дапамагалі сельсаветам у правядзеньні веснавой слёбы, праварялі сьпісы на атрыманьне насеньня, крэдытаў і г, д., арганізавалі яшчэ два сельска-гаспадарчыя калектывы з 24-х двароў і пераявалі на шматпольле дзьве падшэфныя вёскі.

Праца Аршанскага саюзу савгандальслужачых зьяўляецца прыкладнаю для іншых саюзаў.

А. К.

Пачаліся спаборніцтвы на палёх Аршаншчыны.

Аршанская округа, добра падрыхтаваўшыся да правядзеньня веснавой сяўбы і арганізаваўшая працу па падвышэньні ўраджайнасьці, адстала ў правядзеньні спаборніцтваў на палёх. У гэтай працы округа трошкі спазьнілася. Але ў сучасны момант спаборніцтва на палёх Аршаншчыны ўжо пачалося.

Першай ластаўкай у гэтым была камуна „10-ы Кастрычнік“, Аршанскага райёну. Гэта камуна арганізавалася яшчэ толькі ў мінулым годзе на землі працоўнага карыстаньня, у склад якой увайшло 13 бядняцка-сераднякіх двароў. Ня гледзячы на гэта, камуна „10-ы Кастрычнік“ у гэтым годзе ўжо пераходзіць на грамадзкае харчаваньне і пабудавала агульную сталоўку.

Гэта маладая камуна апярэдзіла іншыя камуны округі, якія ўжо існуюць каля 10 гадоў. Такімі камунамі зьяўляюцца: „Шлях Селяніна“. Мсьціслаўскага райёну і „Араты“, Расьнянскага райёну; іх вызвала на спаборніцтва камуна „10-ы Кастрычнік“.

Умовы гэтага спаборніцтва такія: ліквідаваць звычайны папар і перайсьці на раньні, увесь зімовы клін засеяць сартавым насеньнем і радавою сеялкай, у васеньні час забараніць пасьбу скаціны на ўсходах жыта, узараць яравую плошчу на зяб, у час асеньняй кампаніі ўстанавіць зерноачысьцільныя машыны дзеля ачысткі насеньня бяднейшаму акаляючаму сялянству, арганізаваць злучны пункт для сялянства, на сто процантаў здаць усю закантрактаваную прадукцыю і лішкі прадаць с.-г. кааперацыі, да зімы зрабіць ацяпленьне хлявоў з устаноўкай дацкіх кармушак і перайсьці на нарміраванае харчаваньне жывёлы, а ўсе будынкі, якія будуць будавацца ў гэтым годзе, пакрыць чарапіцаю, залажыць яму для сіласаваньня корму, да 7 лістапада гэтага году перайсьці на грамадзкае харчаваньне і паставіць радыё, да 1 мая будучага году ліквідаваць няпісьменнасьць сярод сяброў камуны ў узросьце ад 16 да 40 гадоў, арганізаваць чырвоны куток і здабыць бібліятэку і на арганізаваную ў камуне дзіцячую пляцоўку прыняць 10 дзяцей акаляючага бяднейшага сялянства.

Створана ўжо камісія, якая павінна будзе 8 лістапада паехаць у камуны „Шлях Селяніна“ і „Араты“ для праверкі, ці выкананы поўнасьцю ўмовы спаборніцтва. Другая камісія паедзе туды 2 мая, каб праверыць ці ліквідавана ў камунах няпісьменнасьць.

Гэта камуна дае добры прыклад усяму арганізаванаму ў калгасы сялянству акругі, арганізаваць спаборніцтвы і на сва-

Ворагі пасяўб

(Халопеніцкі р-н).

Толькі і гаворкі ў сялян аб кампаніі сяўбы, аб тым, што не хапае насеньня, што няма за што яго купляць. Сабраўшыся ў кучу гавораць шмат, між гаворкі ясна чуваць лаянка па адрасу заядлых бюракратаў з канторы «Дзьвіналес». Вось каротка аб гэтай лаянцы.

Сяляне Замошскага сельсавету (Халопеніцкага р-ну) усю зіму працавалі ад арганізацыі «Дзьвіналес» на лясных распрацоўках. Радавалася сялянскае сэрца, вот заробім крыху грошай, будзе за што купіць насеньня хлеба і г. д. Але дарма радаваліся. Ідзе ўжо другі месяць як скончыліся самыя галоўныя лясныя распрацоўкі, а расплаты і да гэтага часу няма. Чарада за чарадой сялян амаль што кожны дзень цягнецца за 30 кіл. у гор. Лепель у кантору „Дзьвіналеса» за заработнай платай.

Працаўнікі канторы «Дзьвіналес» кормяць сялян „заўтракамі“ і больш ні чога. І так цягнецца ўжо каля двух месяцаў. Некаторыя сяляне ўжо схадзілі па некалькі раз і, страціўшы ўсякую надзею на атрыманьне заробленай платы, праклінаюць працаўнікоў „Дзьвіналесу“ і пры гэтым кажуць: дзе-ж праўда, няўжо можна так зьдзеквацца над селянінамі.

Так, паважаныя сяляне, ёсьць праўда і так зьдзекваецца з вас, як зьдзекуюцца лепельскія бюракраты з канторы «Дзьвіналес», ня можна. Гэтага дапусьціць нельга. Такіх працаўнікоў як Махровіч, які корміць сялян «заўтракамі», які зьдзекуецца над сялянамі, які зрывае галоўнае мерапрыёмства па падняцьню ўраджайнасьці вясеньняй сяўбы, надыходзячая чыстка выкіне як сьмецьце з апарату.

Праежджы.

Тэрнацыянальны харчавікоў.

САЦЫЯЛ-ЗДРАДНІКІ АДХІЛІЛІ ПРАПАНОВУ САВЕЦКАЕ ДЭЛЕГАЦЫІ АБ ДАПАМОЗЕ БАСТУЮЧЫМ.

СТАКГОЛЬМ, 7-6. На пасяджэньні прэзыдыюму інтэрнацыянальнага харчавікоў савецкая дэлегацыя падала прапанову аб матэрыяльнай дапамозе бастуючым тытуневым [illegible] было адхілена.

Аб масавай культпрацы прафсаюзаў.

Рабочы клюб павінен стаць сапраўдным сьветачам масавага сацыялістычнага перавыхаваньня. Развал і санлівасьць павінны ўступіць месца сталай плянавай культурнай палітасьветнай працы.

Рабачком ня дбае аб культпрацы.

(Савгас Жылічы, Бабруйскай акругі).

Наш рабочы клюб знаходзіцца ў вялікім двухпавярховым палацы. Але ў сярэдзіне клюб па сваім выглядзе амаль што нічым не адрозьніваецца ад хлеву. Праўда, там ёсьць адзін партрэт Леніна і пакрытыя пылам плякаты 1921 году. Санітарнае становішча клюбу дрэннае. Пры ўваходзе ў клюб вы ўбачыце агромадную кучу сьмецьця. Падлога клюбу мыецца адзін раз у год, а ў іншы раз вы на падлозе ўбачыце на паўаршына гразі. Ёсьць ў клюбе некалькі лавак і тыя з гнілымі ножкамі, сесьці на іх небясьпечна. У клюбе ёсьць бібліятэка, але яна не скарыстоўваецца рабочымі. Газэты і часопісі выпісваюцца, але іх рабочыя ня чытаюць, бо клюб амаль што кожны дзень зачынен на замок, ды і ня цікава ў клюб заходзіць, бо чытальня сваім безгаспадарчым выглядам ня вабіць да сябе чытача. Ніякай клюбнай працы не вядзецца, няма ніякіх гурткоў. Прафсаюзны гурток, які павінен абавязкова быць, бо большая частка сяброў саюзу ня ведаюць статуту, не арганізаваны. Дабрахвотныя арганізацыі, як ячэйкі ТДА-Авіяхіму, МОПР, Прэч няпісьменнасьць—існуюць на паперы, ніякай працы сярод няпісьменных не вядзецца.

Клюбная праца зводзіцца толькі да пастановак дакладаў і спэктакляў напярэдадні рэвалюцыйных сьвят. Вынікі па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод няпісьменных рабочых дрэнныя. З 22 няпісьменных рабочых усяго тры паведвала ліквпункт, а скончыў ліквпункт усяго адзін чалавек.

Адсутнасьць належнай культпрацы сярод рабочых тлумачыцца непрацездольнасьцю самога рабачкому. Старшыня рабачкому Абражэй нічога не зрабіў, каб даць сталы напрамак сябрам камітэту.

Працуе адзін рабселькораўскі гурток і насьценгазэта рабочых, але трэці месяц і тут працы няма, бо жыліцкім кіраўнікам не спадабаўся кірунак сяброў рэдкалегіі і гурткa. Па дамаганьню жыліцкіх кіраўнікоў абрана новая рэдкалегія, якая выпусьціла за два месяцы адзін нумар насьценгазэты ў духу жыліцкіх кіраўнікоў.

Райкомаўцы, замест таго, каб дапамагчы рэдкалегіі, азмазваюць хібы жыліцкіх кіраўнікоў, якія зрываюць насьценгазэты і кампрамэтуюць рабселькораў.

Рабкор Барацьбіт.

Самаадукацыя без мясцкомаўскага кіраўніцтва

(Шклоўскі райён, Магілеўшчына).

Культкамісіі саюзу працасьветы трэба было падагуліць працу настаўніцкіх аб'яднаньняў на паліт. і праф. адукацыі. Быў складзен каляндарны плян з вызначэньнем—хто з сяброў культкамісіі паедзе праводзіць падагуленьне. Плян разаслалі па аб'яднаньнях.

Значная частка настаўнікаў узбударажылася і захвалявалася.

— Што, хлопцы, кажуць, праверка будзе па палітыцы?--кажа на занятках гуртка кіраўнік Лаўроў.

— Так, так, я чуў, што прыедуць, здаецца, 25-га мая.—кажа Шайдаў; сёньня, ў нас 22-га значыць, роўна праз тры дні тут будуць.

— Ну, дык, хлопцы,—зварочваецца кіраўнік гуртка Лаўроў,—нечага дарэмна час марнаваць: зараз-жа ўсе па хатах і на ўсю ноч за работу, а заўтра зноў сюды, падагулім.

— Я чуў, што ніякай праверкі ня будзе,—кажа Букаў,—а проста падагуленьне, што мы прайшлі за год.

— Падагуленьне,—устаючы кажа Пазнанскі.—Я ўжо ведаю, што гэта за падагуленьне. Гэта проста, калі што якое, дык са школы вон, вось што. Цяпер табе ня тое, а чыстка ўсюды. Я ўжо ведаю, ня першы год працую, а дваццаць першы.

— Ну, а я і на заняткі не хадзіла і на падагуленьне не найду,—кажа пэдтэхнікумаўка;—досыць нас там правяралі. Я тое забылася, што яны будуць пытацца.

Пагаварыўшы па душах, настаўнікі разышліся падрыхтоўвацца. Прышоў час праверкі, усе настаўнікі, удзельнікі гуртка, на месцы—сядзяць у школе і рыхтуюцца, чакаюць.

Прыяжджае старшыня культкамісіі тав. Шэндараў. Падыходзе кіраўнік гуртка і пытае:

— Як расьсядзімся—па групах, ці ўсе разам, і як будзеце пытацца—па адным выклікаючы да дошкі, ці агульна?

— Не патрэбна ні адным, ні агульна, а вось вы як кіраўнік, зрабіце інфармацыю—што вы прайшлі і якім мэтадам займаліся і г. д.

Пачаў Лаўроў:

— Чыталі і расказвалі. Было сем заняткаў. Трэба было ўвязваць з практычным жыцьцём і бягучай палітыкай але-ж не ўвязалася і г. д.

Распачаліся спрэчкі, слова старшыні камісіі, які казаў аб спосабах палепшаньня працы на летні час. Асьветнікі ўзварушыліся.—Усе як адзін напіралі на тое, каб мясцком больш даваў заданьняў кожнаму гуртку і каб усё-ж такі рабілі праверку. Адным словам усё тое, чаго так нядаўна баяліся, самі-ж упісалі ў рэзалюцыю, абы толькі палепшыць працу па самаадукацыі.

Р. Хвойка.

„За что им платят деньги?“

Адносна сваечасовай выплаты заработку рабочым і служачым мы маем цалы шэраг законадаўчых актаў і спэцыяльных пастаноў урадавых органаў. З году ў год заключаюцца паміж саюзнымі органамі і гаспадарнікамі калектыўныя дагаворы на працаўнікоў. З году ў год першым пунктам калектыўнага дагавору абумоўліваецца сваечасовая выплата пэнсіі працаўнікам гаспадарчымі ўстановамі. Гэты пункт ніколі не сустракаў супярэчнасьцяй з боку гаспадарнікаў, і бязумоўна, падпісваўся імі для выкананьня.

Але для некаторых гаспадарнікаў і адміністратараў ні пастановы ўрадавых органаў, ні калектыўныя дагаворы, якія яны падпісваюць, ніякага значэньня ня маюць. Ёсьць выпадкі проста бюракратычных, чыноўніцкіх, злачынных адносін да працаўнікоў, калі яны хочуць атрымаць пэнсію.

У Езярышчанскім райёне Віцебскай акругі бухгальтар РВК ніколі ня дасьць пэнсіі настаўнікам, калі яны яго не папросьць, ці пападуць наогул пад дрэнны настрой. Між тым РВК ніякіх мер ня прымае, каб прывучыць савецкага служачага адносіцца да наведвальнікаў так, як гэта трэба ў савецкай дзяржаве.

Калі сваечасовая выплата пэнсіі ў Езярышчанскім райёне залежыць ад бухгальтара і яго настрою, дык у Капаткевіцкім райёне Мазырскай акругі—ад загадчыка грашовай часткі РВК Башынскага. Настаўнікам Капаткевіцкай сямігодкі ўжо чацьверты месяц сыстэматычна затрымліваецца выплата пэнсіі. За сакавік месяц зарплата па сямігодцы была выдана ў палове красавіка, за красавік—8 мая, а за май, як паведамляюць настаўнікі, яшчэ ні капейкі не атрымалі.

Калі настаўнікі спыталіся ў Башынскага, калі-ж можна спадзявацца атрымаць зарплату, дык ён адказаў: „Не имею представления“. У гутарцы са старшынёю РВК Башынскі аўтарытэтна заявіў: „Не понимаю, за что этим учителям платят деньги“ і адмовіўся выдаць хоць частку зарплаты.

Ёсьць весткі, што выплата пэнсіі настаўніцтву затрымліваецца ў цэлым шэрагу і іншых райёнаў, напрыклад: у Плешчаніцкім—Менскай акругі, Асьвейскім—Полацкай, Кормянскім і Чырвона-Польскім—Магілеўскай акругі.

Прафсаюзныя арганізацыі павінны рашуча рэагаваць на ўсякія выпадкі затрыманьня пэнсіі асьветнікам.

М. Я.

Клюб у канюшні.

(Чашнікі, Віцебскай акругі).

На папяровай фабрыцы «Красная Звезда“ налічваецца 600 рабочых, а разам з членамі іх сем'яў—да 2000 чалавек. Месцам для культурна-асьветнай працы служыць тут былая стайня абшарніка. У гэтым памяшканьні, так званым клюбе, можа ўмясьціцца ня больш двухсот чалавек. Пры такім становішчы тут ня можа быць ня толькі культурна-асьветнай працы, а нават няма дзе рабочаму ў гадзіны адпачынку пачытаць газэту.

Рабочыя фабрыкі ўжо чатыры гады дамагаюцца, каб пабудавалі клюб. На ўсіх сходах і канфэрэнцыях гавораць аб гэтым, выносяць адпаведныя пастановы. Прадстаўнікі акруговых і цэнтральных арганізацый абяцаюць садзейнічаць водпуску сродкаў, але, відаць, забываюцца, таму клюбу як ня было, так і цяпер няма.

Рабочыя і служачыя зрабілі адлічэньне 2-х дзённага заработку ў фонд пабудовы клюбу.

Пара ўжо зьвярнуць увагу на жыцьцёвыя запатрабаваньні рабочых і пабудаваць ім клюб.

Рабочы.

Паліткурсы пры доме Асьветы.

Закончылі сваю працу паліткурсы пры доме Асьветы, арганізаваныя ўвосень мінулага году культаддзелам ЦП саюзу Працасьветы.

У праграмы курсаў ува

КУТОК РАБСЕЛЬКОРА

ПАТРЭБЕН ПЕРАЛОМ.

Такое парткіраўніцтва селькорамі нічога ня варта.

(Самахвалавіцкі райён).

У апошнія часы Самахвалавіцкі райён прагучэў такімі падзеямі, як забойства селькора Івановіча, спроба селькора Ўцяха скончыць жыцьцё самагубствам, замазваньне насьценгазэты ў в. Пацяўшчына, напад на старшыню сельсавету і інш.

Усе гэтыя падзеі сыгналізуюць нам аб наступе клясавага ворага, які намацаў наш слабы неабаронены фронт. Гэтым фронтам аказаліся рабселькораўскія шэрагі, якія зьяўляюцца гразою кулацкіх элемэнтаў вёскі.

Гэтыя-ж самыя падзеі гавораць нам і аб тым, што райённыя кіруючыя арганізацыі ў асобе РК КП(б)Б, Райвыканкому, Райкому ЛКСМБ, не зьвярнулі належнай увагі арганізацыі контратакі, палягчаючы ворагу наносіць удары нашай грамадзкасьці, выводзіць з строю паасобных грамадзкіх працаўнікоў—селькораў, альбо стараючыхся прыпыніць магутны струмень актыўнасьці працоўных мас.

Выпадкі наступу на мясцовы друк і яго прадстаўнікоў—рабселькораў ня рэдкія, а часьцей ўсяго яны бываюць як раз там, дзе гэты фронт менш усяго абаронен, дзе займаюцца чым хочаце толькі не кіраўніцтвам селькораўскага руху.

Гэткае становішча мы маем і ў Самахвалавіцкім райёне.

Першае, што нам вядома, дык гэта тое, што ў райёне тры разы назначалася райённая нарада селькораў і ні разу не адбылася. Чаму? Ды таму, што нарада толькі **назначалася**, а не **склікалася**. Партыйныя „рацыяналізатары“ палічылі непатрэбным пасылаць селькорам асабовыя паведамленьні, спасылаючыся на тое, што ў каляндарным пляне РК, які ёсьць ва ўсіх ячэйках, вызначан тэрмін нарады і ячэйкі павінны паведаміць селькораў.

Такая падрыхтоўка бязумоўна прывяла да зрыву нарады і селькоры ў сваёй рабоце аказаліся па-за непасрэдным кіраўніцтвам партыйнага камітэту і ў такі важны пэрыяд (як падрыхтоўка да пасеўкампаніі, чыстка савапарату, чыстка партыі, сацыялістычнае спаборніцтва) працавалі і працуюць у разброд, часамі нават слаба ўяўляючы свае задачы, а сярод паасобных селькораў заўважаецца нават рэўнасьць, а не жаданьне на грунце агульных задач сумесна працаваць.

Райком не правёў адпаведных выхаваўчых мер, каб зьнішчыць такія нездаровыя зьявішчы. Наадварот, у практыцы працаўнікоў райкому былі такія выпадкі: калі выклікаўся селькор, якому чыталі натацыю за тое, што ён напісаў аб растратчыку ў каапэрацыі—камунісьце, які зьяўляецца сябрам бюро РК.

Такіх дамарошчаных мэтадаў выхаваньня грамадзкага актыву селькораў мы яшчэ нідзе ў партыйных пастановах не сустракалі. Насьценгазэтамі райком таксама мала цікавіцца і допісы, якія там зьмяшчаюцца не сустракаюць у адпаведных працаўнікоў рэагаваньня. У самым райкоме цэлая пачка заляжалых рабселькораўскіх допісаў, прысланых рэдакцыямі на расьсьледваньне. Маюцца выпадкі фармальных адносін пры недастатковым расьсьледваньні карэспандэнцыі. У выніку ўсяго гэтага стварылася нездаровая атмасфэра сярод селькораў. Гэта нават відаць з лістоў селькораў, паступаючых непасрэдна ў рэдакцыю.

У вывадах камісіі па справе забойства селькора Івановіча райком сам прызнаў, што „кіраўніцтва рабселькораўскім рухам з боку РК нездавальняючае“.

Гэткае становішча ў далейшым нельга дапусьціць. Патрэбен пералом, які прывёў-бы да аздараўленьня рабселькораўскі рух ў раёне.

Заслуга райённага камітэту будзе ня ў тым, што ён сазнаўся ў сваіх недахопах, а ў тым, што гэтыя недахопы ён у набліжэйшы час выправіць.

Я. Чарнецкі.

Вынікі раосельскораўскай крытыкі.

ШКОДНІКІ ЎЗЯТЫ ПАД ВАРТУ.

У допісе „Шкодзяць калектыву“ селькор Лучына паведаміў, што кулакі вёскі Ганьзбэрг, Халопеніцкага р. увесь час рабілі шкоды бяднейшай частцы, якая арганізавалася ў калектыў. Допіс быў накіраваны на расьсьледваньне. Факты пацьвердзіліся. Віноўныя ў шкодзе адданы пад суд і ўзяты пад варту ў менскі спраўдом.

УДАР ПА ПРАТЭКЦЫЯНІЗМУ

Допісам „Яшчэ пра Цытовіча“ селькор Ю. Ю. паведаміў, што лясьнічы Неманіцкага лясьніцтва звольніў з працы сумленнага працаўніка Лагуцька і прыняў на працу незаконна заможніка Хацкевіча і знаёмую Потэс. Допіс быў накіраваны на расьсьледваньне. Расьсьледваньнем устаноўлена, што ў названым лясьніцтве быў пагалоўны пратэкцыянізм. За гэткае зьявішча зроблен выгавар лясьнічаму Цытовічу; зьняты з працы Хацкевіч і Потэс, адноўлен на працу Лагуцька.

ПРАЦАЎНІКОЎ-П'ЯНІЦ — ПАД СУД.

Селькор „Вока“ допісам „Маленькі фэльетон“ паведаміў, што старшыня Выцыня-Албянскага сельсавету Прышчэпаў замест працы займаўся п'янствам. З прычыны нядбайных адносін сельсавету, вырублена каля 100 дзесяцін лесу мясцовага значэньня. Расьсьледваньнем, якое было праведзена Жлобінскім РВК факты пацьвердзіліся. Справа перададзена сьледчым органам для прыцягненьня віноўных да адказнасьці.

ПРЫНЯТЫ АДПАВЕДНЫЯ МЕРЫ.

У допісе „Вінаватых—да адказнасьці“, зьмешчаным у № 79 за 9-V паведамлялася, што мазырскі акрсельсаюз даслаў у Тураўскі райён 250 пудоў лубіну, з якога палова аказалася гнілым. Факты расьсьледваньнем пацьвердзіліся. Да вінаватых прыняты адпаведныя меры.

МАСКАЛЕВІЧ ЗЬНЯТ З ПРАЦЫ.

Па допісу „Галавацяпства ці досьледы“, які паведамляў аб дрэннай працы супрацоўніка досьледчай станцыі Маскалевіча было ўтворана сьледзтва. Факты, зазначаныя ў допісе, пацьвердзіліся. Маскалевіч зьнят з працы. [illegible] 7-мігадзінны дзень працы. Абсьледаваньне паказала значныя посьпехі ад скарачэньня дню працы: **прадукцыйнасьць працы ўзрасла да 40 проц., заработак павялічыўся ў сярэднім на 12 проц., а сабекошт прадукцыі зьнізіўся на 20 проц.**

БУДЗЕ ДОБРЫ ЎРАДЖАЙ.

ПАЛТАВА. 6-6. Стан ярыны ў акрузе добры. У апошнія дні прайшлі дажджы, пасьля чаго настала [illegible] чад [illegible]ор'е.

[illegible]ЛКА ВЫПРАЎЛЕНА.

У допісе „Мо[illegible]треба пачысьціць“, які зьмешчан у № 107 за 15-V паведамляліся, што Белжылсаюз абеджнікам прапанаваў ушчыніць жыльлёвае плошчы да 1,8 кв. саж. на чалавека. Гэты абежнік супярэчыць пастанове СНК, якім вызначана 2 кв. саж.

На допіс Белжылсаюз паведамляе, што гэта частка абежніка зьяўляецца памылковай і зараз дадатковым абежнікам скасавана.

„КІТОЎ“ АМСЬЦІСЛАВА—ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

На допіс „Амсьціслаўскія кіты“, зьмешчаны ў № 26 „Працаўнік Асьветы“ НКА паведамляе, што факты, зазначаныя ў допісе расьсьледваньнем пацьвердзіліся. Справа перададзена на разгляд прэзыдыуму Аршанскага АВК для прыцягненьня вінаватых за трату сродкаў, вызначаных для ліквідацыі няпісьменнасьці, на аплату працаўнікам, да адказнасьці.

Адказы — карэспандэнтам.

Сролікаву, Крушыне, Л-шу, А. Допісы—„Кулакі“, „Сабралі сяброўскія“, „Новы калектыў“ і „Аб зборы попелу“—друкаваць ня будуць“.

Сарванцу. „Паперы, лічбы і жыцьцё“—накіравана Полацкаму акрсаюзу спажывецкіх т-ваў.

Тураву, Знаючаму, Сумнаму, Стрэлу і Бачыўшаму. Допіс „Далоў валакіту“ накіраваны Менскаму акрсаюзу савгандлуж. „Заметка“—Быхаўскаму РК рабземлесу, „На пажар без вады“—Чавускаму РВК, „Жуліка пад суд“—Калінкавіцкай раймілыцы „Непасільны абавязак“—Бабруйск Акрана.

Зубаву, Зыкаву, Бязьмежнаму, Сролікаву і Ведаючаму. „Воўк“—накіравана Магілеўскай акрстрахкасе, „Чалавек працуе“—Слуцкаму райпракурору, „Чавуская пажарная“—Чавускаму РВК, „Самаабкладваньне“—Уваравіцкаму РВК і „Як ня выхоўвалі“—Дрыбінскай раймілыцы.

Чамаданаву, Бязьмежнаму, Палянскаму. Допісы—„Як жывуць“, „Вылазкі“ і „Заводзкім“—друкавацца ня будуць.

Ячэйцы „Друг дзяцей“. Допіс „Як профсаюзныя бюракраты“—ня пойдзе, бо невядома, у якой мясцовасьці гэта адбываецца.

ЗЬНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ ПРАДУКЦЫІ ПАД ПАГРОЗАЙ.

Недастатковая ўвага гаспадарчых органаў.

У ВСНГБ нашаму супрацоўніку паведамілі, што ў 1-м квартале бягучага гаспадарчага году па рэспубліканскай прамысловасьці ВСНГ Бел. сабекошт прадукцыі быў зьніжан у сярэднім на 3 проц. Аднак, менш спрыяючыя ўмовы работы прамысловасьці ў II-м квартале пагоршылі справу са зьніжэньнем сабекошту, і ў выніку—за першае паўгодзьдзе мы маем зьніжэньне ўсяго толькі на 2,5 проц.

З матар'ялаў відаць, што за выключэньнем 2-3 трэстаў, другі квартал дае павялічэньне сабекошту прадукцыі. Калі ў першым квартале па прамысловасьці шклотрэсту сабекошт прадукцыі супроць сярэдняга ўзроўню мінулага году быў зьніжан на 5 проц., дык за ўсё першае паўгодзьдзе зьніжэньне сабекошту дасягнула ўсяго толькі 3,3 проц.; па прамысловасьці запалкавага трэсту ў 1 кв.—на 5,2 проц., а за паўгодзьдзе—на 3,1 проц.; па скуртрэсту сабекошт прадукцыі ў 1-м квартале быў зьніжан на 3,3 пр., а за ўсё першае паўгодзьдзе—толькі на 1,6 проц.

Асабліва кепска абстаіць справа са зьніжэньнем сабекошту прадукцыі на папяровай фабр. „Прафінтэрн“, скураным заводзе „Бальшавік“ і на шклозаводзе «Кастрычнік».

У другім квартале зрабілі далейшае зьніжэньне сабекошту прадукцыі: папяровы трэст (у 1 кв. на 3,8 проц. а за паўгодзьдзе—4,2 проц.) і панчошна-трыкатажная фабрыка з 0,5 пр. у першым квартале за паўгодзьдзе зьнізіла сабекошт прадукцыі на 3 процанты.

Павялічэньне сабекошту прадукцыі ў II-м квартале, апрача абвастрэньня пытаньня з дастаўкай сыравіны, невыкананьня пляну ў адносінах узьняцьця вытворчасьці працы і спазьненьня з пускам у ход рэканструіраваных цэхаў і прадпрыёмстваў, тлумачыцца таксама недастатковай увагай з боку гаспадарчых органаў да пытаньня зьніжэньня сабекошту прадукцыі.

Гэта становішча настойліва патрабуе прыняцьця самых рашучых мер, каб папоўніць той прабел, які мы маем за першае паўгодзьдзе бягучага гаспадарчага году, бо неабходна памятаць, што ад выкананьня дырэктыў аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі будзе залежыць ажыцьцяўленьне ўсяго прамфінпляну нашай прамысловасьці.

Трэба максымальна скарыстаць сацыялістычнае спаборніцтва, уцягваючы ў працу па зьніжэньні сабекошту ўвесь тэхнічны пэрсанал.

Выкананьне дырэктыў аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі зьяўляецца ўдарнай задачай сёнешняга дня і ўсяго далейшага пэрыяду ў працы нашай прамысловасьці.

В. Зайцаў.

ХРОНІКА.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦСПСБ.

Становішча працкалектываў.

Наркампрацы зрабіў на прэзыдыуме ЦСПСБ даклад аб становішчы і дзейнасьці працкалектываў у БССР.

З дакладу відаць, што ў працкалектывы за апошнія 1½ гады ўцягнута 5056 беспрацоўных. За гэты пэрыяд пад кіраўніцтва мясцовай прамысловасьці перададзена 32 прадпрыёмствы працкалектываў з 2972 рабочымі. Павялічваецца і сярэдняя заработная плата занятых у працкалектывах. Побач з дадатнымі бакамі ёсьць яшчэ і шэраг недахопаў у становішчы нашых працкалектываў. Так, працкалектывы недастаткова забясьпечваюцца аспоўнымі відамі сыравіны, банкаўскі крэдыт не адпавядае ўзросшым запатрабаваньням працкалектываў, зьнізілася ўдзельная вага членаў саюзу з 79,8 проц. да 71 проц., недастаткова праводзіцца зьмяняемасьць беспрацоўных, слаба праводзіцца ў працкалектывах мерапрыёмствы па ахове працы.

Прэзыдыум даў цэлы шэраг практычных указаньняў для зьнішчэньня ўсіх недахопаў і да разгортваньня працы навакольнай пытаньня павялічэньня вытворчасьці працы і ўзьняцьця працоўнай дысцыпліны.

Парадак абслугоўваньня садам «Прафінтэрн».

Прэзыдыум ЦСПСБ зацьвердзіў у асноўным распрацаваны культаддзелам парадак абслугоўваньня садам „Прафінтэрн“ членаў прафсаюзаў і гарадзкога насельніцтва.

Сад будзе адчынен з 7 гадз. раніцы да 4 дню і з 6 гадз. да 12 гадз. ночы. Кожную нядзелю ў садзе будуць наладжвацца дзіцячыя бясплатныя ранішнікі. На эстрадзе штодзень з 9 гадз. да 12 гадз. ночы—канцэртнае аддзяленьне або кіно.

На аўтарках сад будзе прадастаўляцца саюзам, якія ня маюць сваіх садоў. У садзе „Прафінтэрн“ мяркуецца ўстанавіць 2 гучнагаварыцелі.

Прэзыдыум даручыў прафсаюзам прапрацаваць пытаньне аб кошце ўваходных білетаў. Для наведвальнікаў саду, якія маюць сэзонныя білеты, будзе давацца скідка за пракат вэлёсыпэдаў, за карыстаньне каруселямі, цірам і інш.

Пэнсія старым рабочым.

У Галоўнай Управе Сацыяльнага Страхаваньня нашаму супрацоўніку паведамілі аб новых правілах забясьпечаньня ў парадку сацыяльнага страхаваньня па старасьці.

Такім чынам, да існуючых у нас відаў сацыяльнага страхаваньня дадаецца яшчэ адзін від—страхаваньне па старасьці. Увядзеньне страхаваньня па старасьці мае на мэце, з аднаго боку, забясьпечыць старых рабочых, а з другога—на месца старых, добраахвотна перайшоўшых на пэнсію, уцягнуць у вытворчасьць кадры беспрацоўных.

Пэнсія будзе прызначацца рабочым з 60 гадоў, а работніцам—з 55 гадоў. Для рабочых шкодных прадпрыёмстваў узрост зьніжаецца да 50 год.

Права на пэнсію па старасьці маюць рабочыя чорнай, мэталёвай і тэкстыльнай прамысловасьці, а таксама рабочыя чыгуначнага і воднага транспарту. Пэнсія па старасьці будзе прызначацца незалежна ад працадзольнасьці без мэдыцынскага агляду.

Пэнсію могуць атрымаць рабочыя, якім споўнілася 60 год, і якія маюць 25 год працоўнага стажу, у тым ліку 1 год на апошній рабоце, а работніцы у 55 год—з 20 гадовым працоўным стажам.

Разам з рабочымі права на пэнсію маюць і вылучэнцы з рабочых вышэйпаказаных прафэсій, калі вылучэньне адбылося за 5 год да хадайнічаньня аб пэнсіі.

У выпадку сьмерці асобы, якая атрымоўвала пэнсію па старасьці апошнюю на агульных падставах будзе атрымоўваць сям'я пэнсіянэра.

Пэнсія па старасьці будзе вылічвацца з сярэдняга месячнага заработку за апошні год работы па найму і выдавацца ў палавінным разьмеры, але ня нижэй 20 р. і ня больш 112 руб. 50 кап. у месяц.

Тэрміны падачы заяў аб прызначэньні пэнсіі па старасьці не абмяжоўваюцца.

Забясьпечаньне БССР прамтаварамі.

У III квартале бягучага году завозіцца ў БССР: бавоўнянай мануфактуры на 5212000 руб., сукна—на 335000 руб., гатовай вопраткі—на 2089000 руб., скураных тавараў—на 500000 руб., абутку—на 1600000 руб., галёш—на 174000 руб., мыла—на 437000 руб. і чаю завозіцца на 155000 руб.

Арганізацыя трактарных калён.

У савгасах Белсельтрэсту з наступнага году арганізуюцца 15 трактарных калён, якія будуць складацца з 100 трактараў. Будзе арганізавана 5 калён па 10 трактараў кожная і 10 калён па 5 трактараў.

Пашырэньне хромавага цэху на „Бальшавіку“

Скураному трэсту дазволена выдатковаць 44539 руб. на пашырэньне і даабсталяваньне хромавага цэху на скураным заводзе „Бальшавік“. У цэху будуць устаноўлены ўдасканаленыя машыны для апрацоўкі хрому.

Парушыцеляў дырэктыў прамфінпляну—на чорную дошку.

Прэзыдыум ВСНГ Бел. лічыць неабходным увесьці ў друку „чорную дошку“ на якую будуць заносіцца прадпрыёмствы і асобныя працаўнікі прамысловасьці, парушаючыя асноўныя дырэктывы прамфінпляну, у прыватнасьці, у адносінах сабекошту.

Адбор прадпрыёмстваў для занясеньня на чорную дошку даручан спэцыяльна абранай камісіі пад старшынствам тав. Стракоўскага.

Першы сьпіс такіх прадпрыёмстваў будзе абвешчан у друку 20 чэрвеня.

На будаўніцтве каналізацыі.

Работы па пракладцы каналізацыі ў Менску разгортваюцца. Зараз на работах штодзень занята да 400 рабочых. Распачаты работы па пракладцы вадапровода ад насосной станцыі да палёў фільтрацыі і ў першых днёх лістапада станцыя будзе пушчана. Ідуць работы па далучэньні да каналізацыі домаўладаньняў.

Эксплёатацыя каналізацыі пачнецца з 1 лістапада.

Жыльлёвае будаўніцтва ў Менску.

Распачаты работы па кладцы фундаманту дому на 52 кватэры па Маскоўскай вуліцы. Заканчваюцца работы па будаўніцтву 12-кватэрнага дому на плошчы Парыскай Камуны. Ідзе таксама знадворная і ўнутраная атынкоўка 70-кватэрнага дому, які будзе гатоў у лістападзе. Заканчваецца будаўніцтва 12-кватэрнага дому па Маскоўскай вул.

Сёлета ў жыльлёвы фонд менскага камгасу будзе атрымана 94 кватэры з агульнай плошчай у 3200 кв. мэтраў.

Распрацоўка крэйдавых адкідаў Добрускай фабрыкі.

Беларускі папяровы трэст прыступае да арганізацыі работ па распрацоўцы крэйдавых адкідаў на Добрускай папяровай фабрыцы.

На пабудову будынкаў, абсталяваньне і земляныя работы на гэтым прадпрыёмстве трэсту адпушчана 40.000 руб.

Улічваючы тэрміновасьць гэтай справы, ВСНГБ даручыў папертрэсту неадкладна распачаць работы.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь“ для рэцэнзіі наступныя кнігі і часопісі.

1. **„Лейбка Бэрлінчык“**—М. Даніэль. З яўрэйскай мовы пераклаў Із. Плаўнік. Стар. 31, цана 12 кап. Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

2. **„Научное общество минских врачей“**—1928 г. (пратаколы пасяджэньняў). Выданьне т-ва ўрачоў і ЦП саюзу мэдсанпрацы Беларусі. Стар. 96, цана 1 руб. Менск.

3. **„Червоный шлях“ № 4.** Грамадзка-палітычны і літаратурна-навуковы журнал. Стар. 216, цана 1 руб. 80 кап. Дзяржаўнага Выдавецтва Украіны.

4. **„Революция и культура“ № 9-10.** Стар. 128, цана 90 кап. Выданьне газэты „Правды“. Масква.

ВЫЯЖДЖАЕМ НА АДНЫХ ТОЛЬКІ „ВІДОВІШЧАХ“.

(Менск, клюб савгандльслужачых).

Нядаўна цэнтральнае праўленьне саюзу „Савгандльслужачых“ вылучыла камісію для абсьледваньня працы клюбу савгандальслужачых.

Пра гэты клюб шмат пісалі, шмат хто лаяў, а некаторыя асьцярожна хвалілі, але-ж апошняе абсьледваньне высьвятліла цэлы шэраг дэфэктаў у працы клюбу, галоўным чынам, зусім адсутнічала выхаваўча-палітычная праца.

Праўленьне клюбу ўдарылася ў відовішчы, запрашала артыстаў з Ленінграду, плаціла ім шалёныя грошы, а „высокакваліфікаваныя“ артысты не здавальнялі масу, не давалі ім таго, што трэба.

Фінансавыя справы вяліся бяз пляну, бяз сыстэмы, і зараз праўленьне клюбу прышло проста да катастрафічнага становішча, да яго нават прад'яўлен іск ад некаторых артыстаў.

Трэба зьмяніць курс працы, трэба ўзяць цьвёрдую лінію на выхаваўча-палітычную працу, трэба адмовіцца ад тэатральшчыны. Драмгурткі, што існуюць пры клюбе, глядзяць на сябе як на вялікіх артыстаў.

Працу клюбу трэба аздаравіць. Свой ляў там з таварышам і прастытуткамі, якія ў яго ўкралі грошы і заразілі ганарэяй. Муж заразіў жонку. Паразілася дзіцё, але яно [illegible] абслепла, бо ад хворай маткі атрымала ганарэю вока. Таварыш таксама ажаніўся і заразіў сваю жонку. Абодва запусьцілі хваробу. Праз гэта яна стала бязьдзетнаю, а ў яго хвароба перашла ў суставы і прымусіла зьлегчы ў ложак...

Фільм з мастацкага боку добра афармлены. Добра граюць артысты. Праз гэта пакідае па сабе добрае ўражаньне і зьяўляецца сур'ёзнаю перасьцярогаю для нашае моладзі. Фільм заслугоўвае вялікае да сябе ўвагі з боку [illegible] і жадана арганізаванае наведаньне. Габ.

КІНО.

„ЗА ЧУЖЫЯ ГРАХІ“.

(«Інтэрнацыянал»).

Адна з самых распаўсюджаных і разам з тым небясьпечных хвароб, [illegible] яе запусьціць,—ганарэя. „За чужыя грахі“—фільма аб ганарэі. Гэнты культурфільм удала афармлены. Таму ён з цікавасьцю глядзіцца, не залежна ад тэй карысьці, у сэнсе перасьцярогі якую ён дае гледачу.

Сюжэт фільму разгорнут так: каля партовага гораду знаходзіцца рыбацкая вёска. У ёй жыве шчасьлівая маладая пара. Жонка дома гаспадарыць, муж працуе ў каапэратыве. Аднаго разу муж паехаў у горад па тавары для каапэратыву. Загуляў там з таварышам і прастытуткамі, якія ў яго ўкралі грошы і заразілі ганарэяй. Муж заразіў жонку. Паразілася дзіцё, але яно [illegible] абслепла, бо ад хворай маткі атрымала ганарэю вока. Таварыш таксама ажаніўся і заразіў сваю жонку. Абодва запусьцілі хваробу. Праз гэта яна стала бязьдзетнаю, а ў яго хвароба перашла ў суставы і прымусіла зьлегчы ў ложак...

Фільм з мастацкага боку добра афармлены. Добра граюць артысты. Праз гэта пакідае па сабе добрае ўражаньне і зьяўляецца сур'ёзнаю перасьцярогаю для нашае моладзі. Фільм заслугоўвае вялікае да сябе увагі з боку [illegible] і жадана арганізаванае наведаньне. Габ.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

Катыроўка пазык на 8 чэрвеня 1929 г.

	Пакуп.	Прад.
1-я 6 проц. залат. выйгр. пазыка	4.80	—
2-я 6 проц. залат. выйгр. пазыка	5.00	—
Бяспроц. залат. выйгр. пазыка 1926 г.	124 25	126 25
10 проц. дзярж. выйгр. пазыка 1927 г.	25.85	25.95
6 проц. дзярж. выйгрыш. пазыка індустр.	25.30	25.40
3-я сялянск. выйгр. пазыка 1927 г.	5.00	—
12 проц. дзярж. унутр. пазыка 1927 г.	100.18	—
2-я 6 проц. паз. проц. выш.	26.49	26.59
Пазыка Індустр. бяспр.	25.73	25.83
11 проц. дзярж. унутр. паз. 1928 г.	102.90	102.95
Дзярж. пазыка 29 г.	100.77	101.17

Апавяшчэньні.

Да ведама членаў і кандыдатаў ЦК ЛКСМБ, членаў рэвізыйных камісій Ўдзельнікаў пашыранага пленуму ЦК.

У панядзелак, 10 чэрвеня адбудзецца пасяджаньне пашыранага пленуму ЦК Камсамолу з наступнай абвесткай дню:

1. Палітычны даклад ЦК партыі.
2. Даклад ад ЦК УсеЛКСМ.
3. Даклад бюро ЦК ЛКСМБ.
4. Даклад ЦСПСБ аб рабоце прафсаюзаў сярод рабочай моладзі і садаклад ОТО ЦК ЛКСМБ аб становішчы працы і адукацыі рабочай моладзі.

На Пленум запрашаюцца прадстаўнікі ЦК Камсамолу ў ЦП прафсаюзаў і іншыя ўстановы, акрамя Бюро Менскага АК і рэдактары юнацкіх газэт.

За матар'яламі і пасьведчаньнямі зьвяцца ў ЦК, 10-VI Савецкая № 45.

Сакратар ЦК ЛКСМБ ГАЛАВАЧ.

Сёньня 8-VI г. г. а 5 гадзіне дню, у памяшканьні Біржы Працы (заля вытворчай сэкцыі) адбудзецца адчыненае пасяджэньне камісіі па чыстцы апарату Біржы Працы і беспрацоўных разумовай сэкцыі. Чыстку праходзяць:

1. Заг. Біржы Працы тав. ДУМЛЕР.
2. Сакратар „ САВЕШЧУК.
3. Заг. разум. сэкцыяй „ ДЭМІДОВІЧ.
4. Дзелавод вытворч. „ КАСЬЦЮК.
5. Заг. разум. сэкц. „ ТАРАСАЎ.
6. Заг. Сэкц. чорнараб. „ ГРУНЕЦКІ.
7. Дзелавод „ МАРКЕВІЧ.
8. Заг. сэкц. буд. „ РАДЗІЁНАЎ.
9. Заг. Бел. Аддз. Цэнтрапасрэдрабіо „ ПРАГІН
10. Заг. юнсэкцыяй „ КАПЛАН.

Просьба да ўсіх рабочых, служачых і беспрацоўных прыйсьці і прынаць актыўны ўдзел у самой працы па чыстцы.

Сад саюзу сельгаслесарабочых—кіно-сад „Чырвоная Зорка“ (Савецкая, 71).

Члены саюзу СГЛР атрымліваюць зьніжэньне на білеты ў кіно-сад „Чырвоная Зорка“ ў разьмеры 30 проц. (пры прад'яўленьні прафсаюзнага білету паказаньне зьніжэньне робіцца на 2 білеты ў кіно).

Па панядзелках з 12 да 4-х гадзін дню ў садзе адчынена чытальня з часопісамі, газэтамі, шахматамі і іншымі іграмі.

Па панядзелках: з 6-ці да 9-ці гадзін вечару—чытальня, а з 9-ці гадзін вечару—бясплатны кіно-сэанс для членаў саюзу і іх утрыманцаў.

Уваход па прафсаюзных білетах.

САД АСЬВЕТЫ.

— Сёньня вялікае гуляньне, концэрт і кіно. Пачатак а 6 гад. Білеты ад 20—25 к.

ПЭДГАБІНЭТ.

— У суботу, 8-га чэрвеня конфэрэнцыя выкладчыкаў прыродазнаўства і географіі школ г. Менску.

Пачатак у 7 гадзін Увечары.

У НАВУКОВЫМ Т-ВЕ.

— У нядзелю 9 г. м. у Фізычнай аўдыторыі БДУ а 7 гадз. увеч. адбудзецца сход Фіз.-Матэм. Сэкцыі. —Справаздача проф. Я. Громэра аб Харкаўскай канфэрэнцыі па пытаньнях тэорыі адноснасьці і новай квантавай мэханікі.

— У нядзелю, 9 чэрвеня, а 11 гадзіне дня ў Доме Працаўнікоў Асьветы (Комуністычная вул, д. № 19, пакой № 4), адбудзецца конфэрэнцыя краязнаўчых гурткоў школ гораду Менску.

ПАРАДАК КОНФЭРЭНЦЫІ:

1. Інфармацыя гурткоў аб праробленай працы.

2. Разгляд інструкцыі Менскага акругавага т-ва краязнаўства—„Арганізацыя і зьмест працы школьна-краязнаўчых гурткоў“.

3. Абмеркаваньне заданьняў на лета.

Прысутнасьць усіх сяброў гурткоў абавязкова. Запрашаецца настаўніцтва і піанэр-працаўнікі.

Просьба да настаўнікаў паведаміць вучняў аб месцы і часе канфэрэнцыі.

Час. вык. аб. адказн. рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО-ЦЫРК

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
Субота, 8 чэрвеня.
САЮЗУ ГАРБАРОЎ. І Н Г А
Пачатак а 8 з пал. гадз. ўвечары.

ЦЫРК. СЁНЬНЯ 8 ЧЭРВЕНЯ. **Урачыстае адчыненьне Дзяржцырку.** Пачатак у 9 гадзін увечары.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ **„СЫГНАЛ З МОРА“** Пачатак а 7 з пал. гадзіне. Каса а 6 г.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“ З АЎТОРКА 4 ЧЭРВЕНЯ **„ЛЯСНЫ ЧАЛАВЕК“** пачатак а 8 гадзіне.

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71. З АЎТОРКА, 4 ЧЭРВЕНЯ. **„400 МІЛІЁНАЎ“** ШТОДЗЁННА 2 СЭАНСЫ Пачатак 1-га а 9 гадзіне Каса а 7 гадзіне.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». БЫТАВЫ ФІЛЬМ **„ЗА ЧУЖЫЯ ГРАХІ“** у 6 частках. Пачатак а 7 з пал. гадзіне.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС
дзяржаўнай фабрыкі абутку „САМАХОД“
на 1-е кастрычніка 1928 г.

АКТЫЎ

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Сума прыватная	Сума агульная	Проц. да вынікаў балянсу
I. МАЁМАСЬЦЬ:			
Абсталяваньне і машыны	19806—48		
Інструманты	2241—73		
Гаспадарчы інвэнтар	7577—82	29626—03	6,8
II. МАТАР'ЯЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЬЦІ:			
Сыравіна і асноўн. матар'ялы	39884—76		
Напал	167 —		
Дапаможн. матар'ялы	7300—48		
Паўфабрыкаты	6304—73		
Гатовыя вырабы	74419—48	128076—45	29,2
III. ГРАШОВ. СРОДКІ І КАШТОЎН. ПАПЕРЫ:			
Каса	534—79		
Бягучыя рахункі	7401—30		
Паі	358—65		
Аблігацыі дзяржпазык і інш. паперы	3471—65	11766—39	2,7
IV. НЯСКОНЧАНАЯ ВЫТВОРЧАСЬЦЬ		54669—39	12,4
V. ВЭКСАЛІ І ДАКУМ. ДА АТРЫМ.:			
Вэксалі ў партфэлі	20642—85		
„ пратэстаў	157—28		
„ у вучоце	117951—26	138751—39	31,6
VI. ПАДСПРАВАЗДАЧНЫЯ СУМЫ		235—48	0,05
VII. ДЭБІТОРЫ:			
Рабочыя і служачыя	13590—28		
Пастаўшчыкі і падрадчыкі	3462—82		
Пакупнікі і заказчыкі	25943—84		
Дэбіторы розныя	9594—84		
Няпэўныя даўгі	11074—84	62666—62	14,25
VIII. ВЫДАТКІ БУДУЧЫХ ГОД		13745—03	3
БАЛЯНС		439536—78	100

ПАСЫЎ

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Сума прыватная	Сума агульная	Проц. да вынікаў балянсу
I. КАПІТАЛЫ:			
Статутны	123141—56		
Амартызацыйны	3040—82		
Рэзэрвны	2451—06	12863—44	29,3
II. ФОНДЫ:			
Фонд палепш. быту раб. і служ.		2076—06	0,5
III. РЭЗЭРВЫ:			
Рэзэрв няпэўн. даўгоў		11232—12	2,6
IV. ПАЗЫКІ, ССУДЫ І КРЭДЫТЫ:			
Ссуда з Прамфонду	9000 —		
Банкі па вучоту вэксал.	117951—26	126951—26	28,8
V. ВЭКСАЛІ ВЫДАДЗЕНЫЯ		60046—33	13,6
VI. КРЭДЫТОРЫ:			
Рабочыя і служачыя	7136—81		
Пастаўшчыкі і падрадчыкі	5753—01		
Пакупнікі і заказчыкі	261—86		
Неаплачан. падаткі і зборы	14228—42		
Крэдыторы розныя	725—95	28105—05	6,4
VII. ВЫНІКІ:			
Чысты прыбыт. справазд. году		82491—52	18,8
БАЛЯНС		439536—78	100

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ.

ДЭБЕТ

СТРАТА	СУМА	Проц. да агульн. вын.
Гандлёвыя выдаткі	42133—73	29,6 проц.
Рэзэрвы на няпэўн. даўгі	5706—88	4 „
Ад сьпісаньня безнадз. даўгоў	632—49	0,4 „
Розныя	12006—27	8,3 „
Чысты прыбытак	82491—52	57,7 „
БАЛЯНС	142970—89	100 проц.

КРЭДЫТ

ПРЫБЫТАК	СУМА	Проц. да агульн. вын.
Ад рэаліз. гатов. выраб.	135546—26	94,8 проц.
Ад выплаты няпэўн. даўгоў	1005—36	0,7 „
Розныя	6419—27	4,5 „
БАЛЯНС	142